№№189–190
(2709–2710)
29 лістапада 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

*На простор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
**Якуб КОЛАС**

**Да ўвагі!**

***Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!***

*Шаноўныя чытачы!*

*Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

**ФАКТ И КОММЕНТАРИЙ**

# Поучимся у грузин?

На днях из Тбилиси пришло сообщение: Михаил Саакашвили сложил с себя президентские полномочия. С одной стороны, обычный факт. Согласно грузинской Конституции, он обязан покинуть высокий должностной пост, если хочет принять участие в выборах. Выиграет — вернется на прежнее место, не выиграет — прощай, власть...

С другой стороны, мы знаем реалии белорусской политики. Сколько ни предлагал Александр Козулин такому же, как он, кандидату в президенты, то есть Александру Лукашенко, оставить на время выборов (а могло случиться, что и навсегда) кабинет в “Красном доме” — тот к голосу оппонента не прислушался. Скажете, в нашей Конституции это не прописано. Но тот же Александр Лукашенко и не желает это прописывать. Сколько оппозиция бьется над тем, чтобы были внесены изменения в Избирательный кодекс — безрезультатно. Ее как будто никто не слышит — ни в Палате представителей Национального собрания, ни в Администрации президента, ни в правительстве, ни в Центральной избирательной комиссии.

Да только ли о сложении призидентских полномочий на период участия в выборах идет речь? В Беларуси никогда не будет демократических выборов, если избирательные комиссии будут формироваться лишь из угодных властям лиц, не допуская к ним представителей оппозиционных партий и либеральных общественных организаций. А что, не нужно гарантировать наблюдателям контроль за подсчетом голосов? А не является ли досрочное голосование анахронизмом или, откровенно говоря, лазейкой для замены бюллетеней, а значит, фальсификации результатов голосования?

Так, тот факт, что Михаил Саакашвили сложил с себя президентские полномочия, чтобы получить право наравне с другими претендентами участвовать в выборах, заставляет нас, белорусов, серьзно задуматься. Как и над другими вещами, о которых я только что сказал. И не ждать с моря погоды, а нужно добиваться демократизации выборов решительными действиями.

**Петр ЛОЗЮК.**

**ДЫЯЛОГ**



*Валерый Варанецкі (злева) і Гернот Эрлер падчас Х Мінскага форуму.* **Фота photo.bymedia.net**

***Гернот ЭРЛЕР,*** *дзяржаўны міністр міністэрства замежных спраў Германіі:*

**— На канец года беларускі парламент прызначыў амністыю... Ці гэта не магчымасць даць свабоду тым, хто знаходзіцца ў турме па палітычных матывах? Гэта будзе магутным сігналам з Мінска.**

***Валерый ВАРАНЕЦКІ,*** *намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь:*

**— Гэтая прапанова мае права на жыццё, і яна павінна разглядацца.**

**АДКРЫТЫМ ТЭКСТАМ**

## ...І Краўчанка першым выпаўзе з засады

Беларусь перажывае не лепшыя часы.

Цэны на прадукты харчавання, жыллё, транспарт безупынна растуць, а пенсіі і заробкі ў большасці людзей настолькі мізэрныя, што плакаць хочацца.

Ніхто не можа прадказаць, што будзе праз месяцдругі, калі Расія падыме тарыфы на газ.

Адным словам, краіна ў небяспецы. Вось тут бы аб’яднацца ўсім здаровым сілам і звярнуцца да нацыі з моцным словам. У рэшце рэшт разам з існуючай уладай знайсці выйсце з неймаверна цяжкай сітуацыі.

Але дзе ж тыя здаровыя сілы? Хто ў турме, хто грэецца ў цёплым офісе, хто ездзіць па Еўропе. А хто часова знайшоў прытулак у Маскве ці ў нейкім іншым расійскім мегаполісе. Напрыклад, усім вядомы Пётр Краўчанка. Я памятаю, як ён здзекліва раскрытыкаваў многіх у сваіх мемуарах. А сам каго нагадвае? Не таго, хто не баіцца цяжкасцяў, не таго, хто не хаваецца ў кусты, калі трэба ўзняцца ў поўны рост і рашуча заявіць пра сваю пазіцыю на ўвесь белы свет. Дзе Вы, Пётр Кузьміч? Калі Вы сышлі ў палітычны нябыт, то так і скажыце. Калі Вы можаце нешта карыснае зрабіць для Беларусі, то зрабіце, не адкладвайце гэта ні на адзін дзень. Непрыемна будзе, калі прыблізяцца, скажам, тыя ж парламенцкія выбары, і Вы першым выпаўзеце з засады.

Позна будзе, ніхто не паверыць у шчырасць Вашых слоў. І, вядома ж, праляціце Вы, Пётр Кузьміч, як фанера над Парыжам.

Прыкладна з такімі ж словамі можна звярнуцца і да многіх іншых “змагароў за народнае шчасце”. Агу, хлопцы, дзе вы?

**Андрэй СЕЛІВАНАЎ, выбаршчык.**

**СІТУАЦЫЯ**

## Польскія госці былі вымушаны з’ехаць

Польскія каардынатары Міжнароднага праекта “Дыялогі з суседзямі” мусілі датэрмінова пакінуць Беларусь з-за анулявання віз.

21—25 лістапада ў Гомелі ў рамках нямецка-польска-беларускага праекта “Дыялогі з суседзямі” праходзіў семінар для школьнікаў і студэнтаў. З польскага боку ў ім удзельнічалі прадстаўнікі грамадскага аб’яднання “Drumla”. Іх турыстычныя візы былі адкрыты па 25 лістапада. Аднак, як паведаміў БелаПАН беларускі каардынатар праекта, актывіст рэспубліканскага грамадскага маладзёжнага аб’яднання “Грамадзянскі форум” Пётр Кузняцоў, 23 лістапада супрацоўнікі гомельскага ўпраўлення па грамадзянстве і міграцыі нечакана анулявалі візы тром польскім удзельнікам.

Паводле слоў П.Кузняцова, на прыватную кватэру, у якой на час візіту ў Гомель спыніліся палякі, з’явіліся супрацоўнікі міліцыі і запатрабавалі прайсці з імі ў аддзел па грамадзянстве і міграцыі і зарэгістравацца. “Зразумела, іншаземцы пагадзіліся. У аддзеле па грамадзянстве і міграцыі ў іх забралі пашпарты і прапанавалі зайсці за дакументамі ў 16.00. Калі ў прызначаны час палякі прыйшлі ў аддзел, ім паведамілі, што іх візы скарочаны да 23 лістапада, і запатрабавалі да 24.00 пікінуць межы Рэспублікі Беларусь, патлумачыўшы гэта тым, што мэта іх знаходжання ў Беларусі не адпавядае мэце, згаданай у візе. На вакзале палякі даведаліся, што ў бліжэйшы час, да тых самых 24 гадзін, выехаць у Польшчу або нават ва Украіну немагчыма. Цягнік да Кіева быў толькі ў 2 гадзіны ночы. Добра, што міліцыянеры дазволілі паехаць палякам у Кіеў сярод ночы”, — расказаў Пётр Кузняцоў.

Паводле яго слоў, польскія ўдзельнікі праекта “былі ў шоку ад здарэння”.

**Алена ГЕРМАНОВІЧ.**

**БЮДЖЭТ-2008**

## У чыноўнікаў адбяруць — міліцыі і вайскоўцам дадуць

Беларускім чыноўнікам у наступным годзе прыйдзецца зацягнуць мацней паясы — менш размаўляць па мабільніках і менш ездзіць у камандзіроўкі. Міністэрства фінансаў з мэтай эканоміі сродкаў прапаноўвае паменшыць некаторыя выдаткі на ўтрыманне чыноўніцкага апарату. Затое на 10,5% павінны вырасці выдаткі на нацыянальную абарону, праваахоўную дзейнасць і гарантаванне бяспекі краіны.

У праекце бюджэту на 2008 год, які зараз дапрацоўваецца ў беларускіх міністэрствах і ведамствах, у прыватнасці, прапаноўваецца замарозіць на ўзроўні сёлетняга года так званыя непершачарговыя выдаткі дзяржаўнага апарату. Пад іх падпадаюць у першую чаргу выдаткі на выплату паслуг сувязі, камандзіровачныя і транспартныя выдаткі. Таксама Мінфін настойвае на тым, каб у наступным годзе напалову скараціць выдаткі апарату на капітальныя рамонты і набыццё абсталявання.

**РЭГІЁН**

## Гродзенскі піўзавод прадаецца

Таргі арганізаваныя ліквідацыйнай камісіяй УДП “Гродзенскі піваварны завод”. Аўкцыён па продажы машын, абсталявання, транспартных сродкаў з паніжэннем кошту пройдзе ў гэтую пятніцу. Нагадаем, што афіцыйна Гродзенскі піўзавод быў зачынены 6 ліпеня 2007 года. Два гады таму быў атрыманы дазвол урада на будаўніцтва новай піваварні.

**Беларусь Tomorrow**

***Напішы, што думаеш, і з’ездзі ў Еўропу!***

*Калі табе да 26 гадоў і ты не абыякавы да будучыні Беларусі, то напішы эсэ і адпраў на электронны адрас* ***belradio@mail.ru***

**Што пісаць?**

Абяры адну з шасці тэм або можаш пісаць па кожнай:
*1. Нацыянальная ідэя*
*2. Высокія тэхналогіі*
*3. Адукацыя*
*4. Культура*
*5. Знешняя палітыка*
*6. Палітычны лад краіны*

**Колькі часу на роздум?**

На напісанне эсэ даецца час да 10 снежня. Прадугледжаны памер працы — не больш за 2000 знакаў. Тэматыка у межах буйной тэмы (напрыклад, адукацыя) можа быць якой заўгодна, ад плана для канкрэтнага універсітэта да глабальнай ацэнкі сістэмы адукацыі.

Усе працы выстаўляюцца на старонку конкурсу на сайце *www.belradio.fm.* За кожную можа галасаваць інтэрнет-аўдыторыя.

**А суддзі хто?**

У якасці суддзяў выступяць вядомыя эксперты ў розных галінах (па адным на кожную тэму).

У іх склад увайшлі;

**Сяргей ПАНЬКОЎСКІ** — кандыдат філасофскіх навук, палітолаг, кіраўнік праекта “Наше мнение”;

**Раман ЯКАЎЛЕЎСКІ** — аглядальнік міжнароднага інтэрнет-партала “Wider Europe”;

**Уладзімір МАЦКЕВІЧ** — філосаф і палітолаг;

**Юрый ЗІСЕР** — старшыня дырэктараў партала tut.by;

**Пётр МАРЦАЎ** — стваральнік газеты БДГ, журналіст, бізнесмен і аналітык;

**Максім ЖБАНКОЎ** — кінакрытык, журналіст, выкладчык “Беларускага калегіума”.

**Як перамагчы і куды едзем?**

У выніку эксперты вызначаюць 6 пераможцаў: па адным на кожную тэму. У дадатак па выніках галасаванняў вызначаюцца яшчэ 2, за працы якіх было аддадзена больш за ўсё галасоў. Гэтыя 8 асобаў паедуць у 4-дзённае падарожжа па Польшчы, дзе сустрэнуцца з палітыкамі, эканамістамі, даведаюцца болей пра польскія рэформы.

І памятайце — чым раней прышляце працу, тым большая колькасць чалавек паспее за яе прагаласаваць.

Кожны тыдзень у нядзелю на хвалях Еўрарадыё і на сайце www.belradio.fm наш новы праект “Беларусь tomorrow” — цыкл дыскусій пра будучыню Беларусі.

**ПАЛІТКУХНЯ**

# У Міколы Статкевіча адзін шлях — у Еўропу!

“Мы — адзіная еўрапейская лева-цэнтрысцкая партыя Беларусі, якая нясе ідэю еўрапейскай інтэграцыі нашай краіны ў еўрапейскую супольнасць”, — заявіў Мікола Статкевіч, адкрываючы ўстаноўчы з’езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада).

Чаму менавіта ўстаноўчы? У 2005 годзе ўнутраныя супярэчнасці і разборкі паміж грамадоўцамі прывялі да таго, што Статкевіч сышоў з пасады старшыні партыі. Крыху пазней па палітычных матывах улады пазбавілі яго свабоды. Па вяртанні з так званай “хіміі” палітык згуртаваў вакол сябе тых сацыял-дэмакратаў, якія ў партыйным канфлікце 2005 года засталіся на яго баку. 25 лістапада 105 рэгіянальных прадстаўнікоў гэтых сацыял-дэмакратаў прынялі новую (старую) Праграму, Статут партыі, на безальтэрнатыўнай аснове абралі яе старшыню (Міколу Статкевіча) і яго намеснікаў, а таксама Цэнтральны камітэт і Цэнтральную рэвізійную камісію.

З’езд таксама зацвердзіў новую назву партыі. Цяпер у Беларусі на аднаго сацыял-дэмакратычнага клона больш: апрача Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), будзе сацыял-дэмакратычная структура пад назвай “Народная грамада (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя)”. Гледзячы на ўсю гэтую стракатасць і раздробленасць сацыял-дэмакратычнага руху ў краіне, складана пярэчыць тым, хто сцвярджае: раз’яднанасць сацыял-дэмакратычных сіл — адна з прычын таго, што беларускія сацыял-дэмакраты, не зважаючы на самы буйны патэнцыял сацыяльнай падтрымкі, да гэтага часу нават не падступіліся да ўлады. Здавалася б, чаго прасцей: сабрацца разам, правесці канферэнцыю, выпрацаваць агульныя падыходы да актуальных праблем палітычнай барацьбы і пачаць працэс аб’яднання. Прапаноў на гэты конт было мноства. Аднак воз і цяпер там. Папярок, як звычайна, становяцца амбіцыі і недалёкасць сацыял-дэмакратычных лідэраў, іх, кажучы мовай вуліцы, шкурныя інтарэсы.

Устаноўчы з’езд “Народнай грамады” таксама абышоў бокам актуальнае пытанне аб’яднання сацыял-дэмакратычных палітыкаў. Тым не менш Мікола Статкевіч даў зразумець, што базавым прынцыпам яднання сацыял-дэмакратаў, іншых дэмакратычных сіл павінна быць стратэгія еўрапейскай інтэграцыі Беларусі. І патлумачыў: у сітуацыі немінучага эканамічнага крызісу сацыял-дэмакратам, каб вярнуць краіну да дэмакратыі, неабходна звязаць масавы вобраз дэмакратычнай апазіцыі з паспяховым праектам. Менавіта такім праектам з’яўляецца ідэя беларуска-еўрапейскай, а не беларуска-расійскай інтэграцыі. Па словах сп.Статкевіча, “Народная грамада” яшчэ пяць гадоў таму падняла еўрапейскі сцяг, пачала праводзіць еўрапейскія кампаніі... Але потым дэмакратычныя партыі (у тым ліку частка сацыял-дэмакратаў) забыліся пра гэта, апусцілі еўрапейскі сцяг, пачалі ўступаць у *“нейкія незразумелыя кааліцыі з камуністамі, прарасійскімі сіламі”*. Зараз задача палягае ў тым, каб зноў падняць еўрапейскі сцяг, зрабіць Еўрапейскі рух галоўнай сілай апазіцыйнага змагання, бо *“еўрапейская інтэграцыя — гэта наш шанц, наша ратаванне”*. У развіццё гэтага стратэгічнага тэзіса з’езд прыняў адпаведны дакумент пад назвай **“Асновы стратэгіі еўрапейскіх сіл Беларусі”.**

Тэма актуальнасці еўрапейскай інтэграцыі Беларусі набыла яшчэ большую вастрыню пасля выступу на з’ездзе аднаго з лідэраў расійскага сацыял-дэмакратычнага руху “Саюз сацыял-дэмакратыі” Паўла Кудзюкіна, які вельмі пераканаўча распавёў аб тым, што *“Расія ўсё мацней спаўзае ў аўтарытарызм, лукашэнкізіруецца”*. Пасля апошніх падзей, звязаных з падрыхтоўкай да думскіх выбараў, ужо можна нават гаварыць аб тым, што расійская ўлада ў сваіх антыдэмакратычных дзеяннях абганяе беларускі рэжым. Зараз не беларускім дэмакратам трэба спадзявацца на расійскіх калег, а наадварот. *“Баюся, што ў Расіі няма вялікіх шанцаў увайсці ў Еўрасаюз, а вось у Беларусі яны, безумоўна, ёсць. І іх нельга згубіць”.*

Апрача “Асноў стратэгіі...”, з’езд “Народнай грамады” прыняў таксама пастанову “Аб стаўленні да парламенцкіх выбараў”. Па сутнасці, яе варта разглядаць як прынцыповую і жорсткую крытыку пазіцыі, якую займаюць многія лідэры Аб’яднаных дэмакратычных сіл. Аб чым ідзе гаворка? Дакумент канстатуе, што рэжымператварыў выбары ў фарс, фактычна дэмакраты пазбаўлены магчымасці гуляць з ім на больш ці менш роўных умовах. *“Таму галоўнай задачай дэмакратычных сіл зараз з’яўляецца не падзел выбарчых акруг паміж патэнцыяльнымі кандыдатамі, а барацьба за змену выбарчага заканадаўства і выкананне 12 прапаноў Еўрасаюза, у тым ліку — і з выкарыстаннем пагрозы байкоту псеўдавыбараў”.*




Сфармуляваны такім чынам падыход да выбараў у Палату прадстаўнікоў уяўляецца цалкам рацыянальным. Можна толькі дзівіцца, чаму апазіцыйныя палітыкі ў сваёй большасці не спяшаюцца ім кіравацца.

Нядзельны ўстаноўчы з’езд “Народнай грамады”, не зважаючы на тое, што спецслужбы не ўмешваліся ў яго ход, так і не быў завершаны. Кіраўніцтва з’езда аб’явіла, што адбылася толькі першая сесія гэтага партыйнага мерапрыемства. Другая адбудзецца праз год-два. Маўляў, так зручней рэгуляваць адносіны з Мінюстам, які ўсё роўна адмовіць у рэгістрацыі... Што ж, у партыйных лідэраў, магчыма, ёсць рэзон так дзейнічаць.

**Вячаслаў ОРГІШ.**

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

# МАЗ как зеркало белорусской промышленности

В Советском Союзе белорусский промышленный комплекс выступал как "сборочный цех" производств, находившихся в остальных республиках. Схемы взаимодействия цепочек производств от сырья до конвейера теоретически выстраивались достаточно грамотно. На практике получалось не так гладко, но это была беда всей советской промышленности, в том числе и машиностроительной отрасли. Так, вокруг автомобильных и тракторостроительных заводов, построенных в БССР, были сосредоточены целевые поставщики, мощность и номенклатура продукции которых были привязаны к этим предприятиям. То есть еще в советские времена был создан кластер, в идеале позволяющий добиться высочайшего уровня конкурентоспособности при оптимизации схем текущих поставок и взаимодействия цепочек "потребитель—поставщик".

Через сравнительно небольшой промежуток времени после того, как Беларусь стала суверенным государством, вновь избранный президент пообещал запустить остановленные заводы и обеспечить граждан страны заработной платой. И он сдержал свое слово: подавляющее большинство заводов работает, и доход граждан близок к советскому уровню, хотя, по сегодняшним ценам, этого явно недостаточно для процветания. Но никто и не обещал сделать доход равным, скажем, немецкому, французскому или шведскому. Граждане к этому уровню уже привыкли и выживают как могут. И граждане выживут, но вот сами производства...

Репортажей о процветании "Горизонта", "Интеграла", МТЗ, МАЗа, БАТЭ и других флагманов белорусской промышленности мы начитались и наслышались. Но оказалось, что методы их *"подъема"* и *"развития"* были исключительно советскими, которые по определению отличаются потрясающе низкой эффективностью. Советский подход отличается ориентацией на команды сверху и на отчетность перед высшими руководителями, а не установкой на рост эффективности, удовлетворенность потребителя и конкурентоспособность. В Советском Союзе высшие правители могли себе позволять такую модель развития до тех пор, пока широко использовался фактически бесплатный труд заключенных, а также пока можно было хищнически эксплуатировать колоссальные природные ресурсы. Как только эти два источника иссякли, неконкурентная затратная модель хозяйствования развалилась вместе с неэффективной политической конструкцией.

Масштабы Беларуси не сравнимы с советскими. Но так как белорусским командирам страны советские модели оказались самыми близкими, они легли в основу развития страны. Что же получилось на самом деле? Рассмотрим все на примере автомобильной промышленности.

Если судить по официальным репортажам, то достижения потрясающие. Объединение, созданное на базе Минского автозавода, показывает колоссальные цифры роста, значительно опережающие темпы роста ВВП, ВНП и промышленности республики. Под маркой МАЗа теперь выпускается не только большое количество моделей грузовых автомобилей и их модификаций, но и масса вариантов и автобусов, и прицепов, и полуприцепов. В потребителях продукции белорусского гиганта ходят и аэропорты, и частные перевозчики, и Агропром, и прочие нуждающиеся в эффективных средствах перевозки людей и грузов.

Это рапорты. На самом деле все гораздо сложнее. В **таблице** приведено сравнение достижений компаний, производящих продукцию одного класса и параллельно развивавшихся, отталкиваясь от приблизительно одинаковых позиций:

| Параметры сравнения | Сравниваемые фирмы | | |
|---|---|---|---|
| | РУП "МАЗ" | ОАО "КамАЗ" | "Скания Групп" |
| Основная продукция | Большегрузная автомобильная, а также автобусная, троллейбусная и прицепная техника | Автомобили грузоподъемностью от 4 до 20 тонн и дизельные двигатели | Автомобили грузоподъемностью от 4 до 20 тонн и автобусы |
| Объем реализации продукции | Около 800 млн долларов | Превышает 2 млрд долларов | Согласно годовой отчетности, 7.81 млрд евро (2006) |
| Количество работающих | Около 38.000 | Около 40.000 | Согласно годовой отчетности, 32.820 (2006) |
| Реализация основной продукции | Более 20.000 автомобилей, свыше 8000 прицепов и полуприцепов, более 1600 автобусов | 43 тыс. грузовых автомобилей КамАЗ ежегодно | В 2006 году более 65.000 единиц большегрузной техники |
| Распространение сборочных производств | Сборочные производства в 4 странах: в Литве, Египте, Иране, Вьетнаме | Сборочные производства в 6 странах: Польше, Казахстане, Азербайджане, Украине, Эфиопии и Вьетнаме | Сборочные производства в 8 странах: Аргентине, Ботсване, Бразилии, Южной Корее, Танзании, Нидерландах, Зимбабве и (временно) в США |

Очевидно отставание в эффективности и от российского конкурента, и от шведского. Известно, что белорусское предприятие вытесняется с рынков конкурентами из-за недостаточного уровня качества самой техники, ее обслуживания и модернизации. Так, это уже произошло в Украине (вытеснение КамАЗом), в Казахстане, в Юго-Восточной Азии.

Корни хронического отставания — в принятом на самом высоком уровне неэффективном варианте развития, представляющем слегка модернизированную советскую модель. Дешевое сырье из России долгое время позволяло поддерживать этот вариант и не дало возможности вывести страну хотя бы на уровень Греции, Испании или Финляндии. Небольшой прогресс не был достаточным для достижения уровня, например, таких шведских фирм, как "Скания" или "Вольво". Отставание усугублялось, несмотря на то, что мощности производства и проектирования, человеческий потенциал и технические возможности предприятий белорусского автомобильного комплекса одного порядка с аналогичными ресурсами этих скандинавских фирм.

И правительство это интуитивно понимает. Но, к сожалению, не меняет своего отношения к управлению предприятиями, постоянно увеличивая вмешательство в их оперативную деятельность. Поступающие от чиновников правительственных органов указания часто противоречат как друг другу, так и интересам предприятий как объектам **бизнеса.**

В слове **"бизнес"** кроется сущность проблем, которые сегодня стоят перед Беларусью. Крупнейшие предприятия страны **не являются бизнес-структурами в общепринятом смысле**, поскольку, находясь в собственности у правительства, а фактически у конкретных чиновников и первого лица Беларуси, они направляют свою деятельность на достижение целей последних. Эти цели не являются предпринимательскими или конкурентными, а вытекают **из политических** и **социальных** задач, которые ставит первое лицо Беларуси.



Достижение целей, сформированных из **политических** задач, должно демонстрировать ***всему миру*** **преимущество существующей политической системы.**

Достижение целей, сформированных из **социальных** задач, должно демонстрировать **гражданам** страны **заботу государства и правительства** о повышении благосостояния населения страны. Ресурсы для решения этих задач можно взять только из промышленных структур, либо применяя налоговые механизмы **(первая модель)**, либо встраивая предприятия в государственные структуры **(вторая модель)**.

В нормальной рыночной экономике применяется первая модель. В ней промышленность, даже будучи в собственности у государства, отделена от чиновников и правительства, и нанятые менеджеры формируют политику управления предприятиями, исходя из требований их максимальной эффективности на конкурентном рыночном поле. Точно установленные законами параметры ответственности и полномочий менеджеров, а также их налоговые, территориальные (в т.ч. экологические) и социальные (по отношению к своему персоналу) обязательства позволяют таким предприятиям работать без тактической и текущей опеки со стороны чиновников, не отвечающих за успех предприятий.

В Беларуси применяется вторая модель. В ней руководители госпредприятий фактически встроены во властную вертикаль — по сути они чиновники. Они стараются решать в первую очередь задачи, поставленные вышестоящим чиновником-руководителем, а не задачи предприятия как объекта **бизнеса**.





Задачи предприятия как объекта **бизнеса** вытекают из его предпринимательской природы. Оно должно добиваться такой эффективности продаж, основанных на удовлетворенности потребителя, которая позволит предприятию достигать конкурентного превосходства, обеспечивающего рост прибыли, капитала и других ключевых бизнес-показателей. Для грамотного решения своих задач предприниматель, безусловно, вынужден повышать и уровень жизни своих работников, и, опосредованно, уровень жизни их семей, а также жителей окружающих муниципальных образований. Но предприятие не должно заниматься решением тех проблем государства и его граждан, которые могут привести к падению конкурентоспособности организации. Такие проблемы входят в число задач, решаемых исключительно государством. И чтобы цели государства и предприятий совпадали, чиновники должны вести чрезвычайно грамотную политику, основанную не на вмешательстве в тактическую и текущую деятельность предприятия, а на тонком регулировании государственных политик и законодательства.

Возвращаясь к МАЗу, можно заметить, что этот крупный хозяйственный субъект фактически является заложником государства, использующего ресурсы автомобильной корпорации для решения своих сиюминутных задач. Предприятие вынуждено создавать продукцию, которая не имеет перспектив (например, автобусы для аэропортов), и несет из-за этого очевидные убытки, зато позволяет чиновникам поддерживать мифы о превосходстве политической системы. Компенсацию этих убытков чиновники осуществляют, имея возможность "обдирать" излишнюю, с их точки зрения, прибыль на конъюнктурно успешных, например, нефтеперерабатывающих направлениях. В результате огромнейший комплекс предприятий, входящих в МАЗ, производит продукцию с чрезвычайно низкой операционной эффективностью, неконкурентного качества, но поддерживаемую не рыночными, а сомнительными дотационными методами.

Долгое время МАЗ выдерживал конкурентное давление благодаря низкой цене. Это преимущество уже практически пропало, поскольку потребителям необходима продукция не очень дорогая, но высокого качества. Всем очевидно, что качество продукции МАЗа не самое высокое, и его необходимо повышать. Решение о выборе методов повышения качества принимал на МАЗе не теоретически подкованный практик, отвечающий за рост эффективности и объемов продаж, а чиновник, несущий ответственность только за одобрение своих отчетов вышестоящим руководителем. Поэтому и был выбран метод, самый выгодный с точки зрения **чиновника**, но не самый эффективный с точки зрения **бизнеса**.

Сертификаты соответствия требованиям стандартов ИСО на МАЗе есть, а уровня качества, позволяющего, например, конкурировать со шведскими, американскими или японскими корпорациями, нет. Зато система менеджмента качества, созданная по самому бюрократизированному варианту, регулярно одобряется аудиторами соответствующих государственных организаций, но не повышает эффективности продаж. В результате качество как минимум не растет. В то же время растет потребность в оборотных ресурсах из-за излишних запасов и оптовых закупок, а покрытие возникающих дополнительных издержек осуществляется за счет государственных субсидий, а не благодаря росту эффективности продаж. Экономисты МАЗа, как и экономисты других госпредприятий, не владея методами управления издержками, особенно в их связи с уровнем качества и эффективности продаж, не могут влиять на эти процессы.

В этом свете кампания по экономии энергоресурсов выглядит по меньшей мере глупо. Технологические и управленческие процессы, изначально рассчитанные не на высокую конкурентоспособность, а на хорошую отчетность начальству, такую отчетность по экономии энергоресурсов тоже создадут. Будет ли достигнута реальная экономия, одновременно поддержанная ростом качества продукции и эффективности продаж? И вырастет ли от этого эффективность деятельности МАЗа в целом? А ведь имеются другие, давно известные пути развития предприятий, обеспечивающие осмысленное уменьшение потребления ресурсов, в том числе энергетических.

Почему же МАЗ не выбрал для себя эти пути оптимизации производства и управления, давно отработанные и описанные лучшими мировыми автомобилестроителями и интенсивно осваиваемые российскими конкурентами? Эти технологии, известные под названиями KAIZEN, или, в американском варианте, "БЕРЕЖЛИВОЕ ПРОИЗВОДСТВО (LEAN PRODUCTION)", подразумевают глубокую перестройку управления **бизнесом**, нацеленную на действительное повышение качества, уменьшение потребности в оборотных ресурсах и увеличение эффективности продаж. По такому пути в своем, скандинавском, варианте давно идет "СКАНИЯ". Этот же путь выбрал КамАЗ. Но это все относится к **БИЗНЕСУ**, которого в Беларуси нет по определению варианта развития страны, выбранного правительством.

Чтобы идти по пути развития **БИЗНЕСА**, необходимо освободить МАЗ от чиновничьей опеки, дать возможность руководству предприятия принять стратегию и решать тактические и текущие задачи в системе, определяемой бизнес-интересами предприятия. Для этого необходимо изменить и роль Министерства промышленности, и политику правительства в целом. Но это и есть тот базис реформ, о котором много говорится, но мало делается. Если эти реформы не произойдут, дальнейшее падение эффективности деятельности МАЗа может привести к полной потере этой отрасли для страны.

**Материал подготовлен группой экспертов под руководством Виктора ИВАШКЕВИЧА.**

АБЗАЦАМ

## Ці адбяруць турмы ў МУС?

Папраўчыя ўстановы сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі павінны перайсці пад юрысдыкцыю Міністэрства юстыцыі. Такую думку выказаў старшыня Вярхоўнага суда Беларусі Валянцін Сукала. Ён адзначыў, што такое рашэнне з'яўляецца часткай рэфармавання судовай сістэмы ў цэлым і адпавядае еўрапейскім стандартам.

## Паўлаў спадзяецца

Старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў спадзяецца стрымаць рост цэн. Ён распарадзіўся ўзмацніць кантроль за цэнамі на рынках і ў гандлёвых цэнтрах, паколькі напярэдадні навагодніх і калядных святаў узрастае попыт на многія тавары. Неабгрунтавана павышаць цэны гандлярам гарадскія ўлады катэгарычна забаранілі. Але ці будзе плён ад гэткіх забарон?

## Рызыкуем...

Ліквіднасць банкаўскага сектара Беларусі з'яўляецца ўразлівай, паказчыкі капіталізацыі пагаршаюцца, і адзначаецца істотная валютная рызыка. Да такой высновы прыйшло міжнароднае рэйтынгавае агенцтва "Fitch Ratings", што апублікавала новую спецыяльную справаздачу, прысвечаную банкаўскай сістэме Беларусі.

## Генерал-разведчык

Указам прэзідэнта Беларусі званне генерал-маёра прысвоена палкоўніку Віктару Крашэўскаму, начальніку галоўнага разведвальнага ўпраўлення — намесніку начальніка Генеральнага штаба Узброеных сіл. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны. Віктар Крашэўскі займае пасаду начальніка ГРУ Генштаба з 15 мая 2006 года.

## Міліцыя бароніць беларускі рынак

МУС Беларусі выдала спецыяльнае распараджэнне "Аб супрацьдзеянні крымінальнай сферы абароту малочнай прадукцыі". Менавіта гэтым дакументам і кіруюцца аператыўныя супрацоўнікі, якія пачалі сапраўднае паляванне на пастаўшчыкоў малочнай прадукцыі з Расіі. Так, падчас правядзення рэйду супрацоўнікі АБЭЗ Ленінскага РАУС г.Магілёва ў краме прадпрыемства "Бім-Бом-торг" канфіскавалі буйную партыю глазіраваных сыркоў (больш за 33 тыс. штук). Даныя малочныя прадукты не мелі дакументаў, якія пацвярджаюць легальнасць набыцця.

## «Чорныя капальнікі» апанавалі Талачыншчыну

Не паспела "раёнка" "Наша Талачыншчына" завяршыць публікацыю серыі матэрыялаў ваеннага гісторыка Міхаіла Каралёва па назвай "Маскоўскія трафеі Напалеона", як у вёсках Талачынскага раёна з'явіліся "чорныя археолагі". Капальнікі ўзброены самымі сучаснымі прыборамі для пошуку металаў, каб паспрабаваць знайсці трафеі французскай арміі. Справа ў тым, што гісторык абгрунтоўвае сенсацыйную версію: скарбы Напалеона зарыты менавіта тут.

## У камандзе папаўненне

У футбаліста нацыянальнай зборнай Беларусі і расійскага клуба "Томь" Віталя Булыгі 23 лістапада нарадзіўся сын. Хлопчык важыць 4 кг 150 грамаў, яго рост 54 сантыметры. Сын Віталя Булыгі атрымаў імя Нікас.

АФІЦЫЙНА

## Дык ці будзе зроблены хоць крок?

**Еўрасаюз гатовы развіваць "блізкія адносіны з Беларуссю і яе народам, як толькі беларускі ўрад прадэманструе паважанне дэмакратычных каштоўнасцяў і асноўных правоў беларускіх грамадзян". Пра гэта гаворыцца ў заяве, распаўсюджанай прэс-службай прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі ва Украіне і Беларусі.**

У заяве зазначаецца, што мінуў год з таго моманту, як Еўракамісія апублікавала дакумент "Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі". Ён прапануе краіне паўнавартаснае партнёрства ў межах Еўрапейскай палітыкі добрасуседства (ЕПД) і пералічвае тыя перавагі, якія можа прынесці беларускім грамадзянам такое партнёрства Беларусі і ЕС. Размова, у прыватнасці, ідзе аб спрашчэнні паездак у ЕС, магчымасцях працаваць і вучыцца ў ЕС, дадатковых магчымасцях для вядзення бізнесу і гандлю ў ЕС, а таксама аб дапамозе Еўрасаюза Беларусі ў правядзенні неабходных рэформ у галінах аховы здароўя і адукацыі, грамадскай адміністрацыі і мясцовага кіравання.

Як зазначаецца ў паведамленні прэс-службы, для паўнавартаснага ўдзелу Беларусі ў ЕПД беларускія ўлады павінны зрабіць "пэўныя крокі да паважанне дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права". Сярод гэтых захадаў, у прыватнасці, называецца вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, павага свабоды слова, свабоды сродкаў масавай інфармацыі і сходаў, правядзенне свабодных і справядлівых выбараў, расследаванне спраў зніклых людзей і паважанне правоў меншасцяў.

*"Праз адзін год пасля апублікавання прапанова ЕС па-ранейшаму застаецца ў сіле"*, — падкрэсліваецца ў паведамленні.

**Таццяна КАРАВЯНКОВА.**

ЧУЛІ?

## Пасылкі з кнігамі вярнуліся назад

**Брэсцкія сацыял-дэмакраты атрымалі назад пасылкі з кнігамі, адпраўленыя імі некалькі дзён таму ў калонію "Віцьба-3", у якой адбывае пакаранне экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін.**

Як паведаміў БелаПАН намеснік старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Валянцін Лазарэнкаў, на вернутых пасылках перакрэслены адрас атрымальніка, а са зваротнага боку стаіць рэзалюцыя "не дазволена" і два подпісы службовых асоб.

"Кнігі, якія мы пасылалі, — афіцыйна выдадзеная мастацкая літаратура. Незразумела, чаму яна не можа папоўніць бібліятэку такой установы. Мы ўпэўнены, не такія там вялікія фонды, каб іх не трэба было папаўняць. Дарэчы, ніводная бібліятэка ніколі не адмаўляецца ад такога кшталту падарункаў. Прычым, наколькі мне вядома, у 2005 годзе Брэсцкая абласная бібліятэка перадала Брэсцкаму следчаму ізалятару кнігі, аб чым паведамлялася ў мясцовых СМІ", — заявіў палітык.

"Наша акцыя была прымеркавана да 25 лістапада — дня нараджэння лідэра БСДП (Грамада) і з'яўлялася праяўленнем салідарнасці з Аляксандрам Казуліным. Апрача таго, у яго адрас было адпраўлена больш за 50 віншавальных паштовак. Спадзяюся, што яны дайшлі да адрасата", — дапоўніў В.Лазарэнкаў.

**Ларыса ШЫГАНАВА.**

АДУСЮЛЬ

## Рабочыя патрабуюць павышэння заробкаў

У звароце да гендырэктара ААТ "Палімір" Аляксандра Шамашова актывісты незалежнага прафсаюза прадпрыемства тлумачаць сваё патрабаванне ростам коштаў на прадукты харчавання і тавары першай неабходнасці.

"Нам няма патрэбнасці даказваць гэты факт дакументальна. Усе мы ходзім у крамы і бачым цэннікі, дзе лічбы змяняюцца ў большы бок. Усе мы атрымліваем разліковыя квіткі і бачым, што лічбы ў іх застылі на адным узроўні", — гаворыцца ў звароце, змешчаным на сайце прафсаюза ААТ "Палімір".

Калі неабходна, прапануецца ў звароце, то прафсаюз гатовы сабраць подпісы рабочых "Паліміра" пад лістом ва ўрад Беларусі.

## Адкрыццё

Сапраўдным адкрыццём скончылася святкаванне Дня работнікаў сельскай гаспадаркі на Магілёўшчыне. Тут знайшлі месца, дзе даяркі атрымліваюць не 700 долараў, як пра тое казаў Аляксандр Лукашэнка, але 700 тысяч рублёў.

Пахваліцца такім дабрабытам цяпер можа АТ "Александрыйскае", што месціцца на малой радзіме беларускага прэзідэнта — у вёсцы Александрыя.

## Латвія спыняе выдачу бясплатных віз

З 21 снежня амбасада Латвіі спыняе выдачу бясплатных віз для грамадзян Беларусі ў сувязі з уступленнем краіны ў Шэнгенскую зону.

Пакуль на ўмовах узаемнасці латвійскія візы для беларусаў і беларускія візы для грамадзян Латвіі выдаюць бясплатна. А з 21 снежня за Шэнгенскую візу беларусам давядзецца заплаціць 60 еўра.

Усе візы, якія выдаюць да 21 снежня, будуць сапраўдныя і пазней, але толькі на тэрыторыі Латвіі. А з 21 снежня амбасада пачне выдаваць Шэнгенскія візы.

## Дыягназ: банкрут

На сёння больш за 130 прадпрыемстваў Віцебшчыны праходзяць працэдуру ліквідацыі. А адно з найбольш вядомых у краіне мэблевых прадпрыемстваў — "Віцебскмэбля" — ужо збанкрутавала. Віцебскі Гаспадарчы суд прыняў рашэнне аб ліквідацыі гэтага ААТ. Прадпрыемства мае даўгоў амаль на 5 мільярдаў рублёў.

## Мы цяпер на сувязі з Аўстрыяй

Кампанія Mobilkom Austria Group абвясціла аб завяршэнні здзелкі па набыцці 70-працэнтнай долі ў статутным фондзе кіпрскай кампаніі SB Telecom, якая з'яўляецца ўласнікам беларускага мабільнага аператара замежнага унітарнага прадпрыемства "Мабільная лічбавая сувязь" (Velcom). Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар кампаніі Telekom Austria Group і Mobilkom Austria Group Барыс Немшыч.

Здзелка адбылася пасля атрымання згоды збоку антыманапольных органаў, і яе сума склала 730 млн еўра. За якую суму беларуская дзяржава прадала свой пакет SB Telecom, дагэтуль так і не вызначана. Прадстаўнікі кампаніі, праўда, гавораць, што сума была "адэкватная".

## Гродзенскага маньяка-міліцыянера расстралялі

Аляксандр Сяргейчык быў прызнаны вінаватым у здзяйсненні шасці забойстваў. У канцы мая гэтага года Вярхоўны суд вынес беламу камандзіру роты Гродзенскага райаддзела дэпартамента аховы МУС смяротны прысуд.

Як паведамляе МУС, на днях (дакладная дата і месца пакарання не разгалошваюцца) прысуд у дачыненні да Сяргейчыка быў выкананы.

*Вячаслаў ОРГІШ, доктар філасофскіх навук*

# Дыягназ



### У пошуках лекаў

Сёння шмат хто пытаецца: з-за чаго праваліліся апошнія апазіцыйныя акцыі?

Эксперты амаль адзінадушна лічаць, што прычыны трэба шукаць у застарэлых хваробах дэмакратычнага руху ў краіне. Беларуская апазіцыя незаўважна для сябе самой ператварылася ў паўмаргінальную супольнасць, адарваную (зразумела, не без актыўнай дапамогі рэжыму) ад асноўных сацыяльных груп насельніцтва.

Людзі не бачаць у апазіцыі аўтарытэтную сілу, здольную абараняць іх інтарэсы ад замахаў з боку дзяржавы, уладаў. Апазіцыйныя лідэры прызвычаіліся да ролі вечных змагароў з дыктатурай, не шукаюць эфектыўных сродкаў барацьбы за ўладу. Паміж партыйнымі элітамі не існуе кансенсусу па асноўных пытаннях стратэгіі змагання з рэжымам, іх раз'ядноўваюць ідэалагічныя супярэчнасці, у іх розны падыход да выбару знешнепалітычнай арыентацыі Беларусі (для адных генеральны прыярытэт — Захад, для другіх — Расія).

Апазіцыя як інстытут грамадзянскай супольнасці не плануе і адпаведна не праводзіць (хаця дэкларуе) палітыку прыцягнення на свой бок дэмакратычна арыентаваных прадстаўнікоў наменклатуры, бізнесу, інтэлектуальнай сферы. Таму кадравыя, арганізацыйныя, агітацыйныя магчымасці апазіцыйнага авангарда застаюцца нязменна слабымі.

Гэта, так бы мовіць, вонкавы дыягназ. На жаль, яго недастаткова, каб паставіць хворага на ногі. Як сведчыць практыка, вельмі істотна для выздараўлення тое, як сам хворы ўсведамляе свой стан, наколькі адэкватна ўяўляе свае праблемы, ад якіх ідуць яго хваробы. Каб хоць крышку праясніць сітуацыю менавіта з гэтага боку, мы скарысталіся канкрэтнай нагодай — папрасілі ўплывовых асоб беларускай апазіцыі патлумачыць некаторыя пытанні, якія тычацца акцыі 4 лістапада.

### Нават у сне не прысніцца

Дык у чым прычына таго, што "Сацыяльны марш" фактычна праваліўся? Вось адказы лідэраў апазіцыі.

**Сяргей КАЛЯКІН,** старшыня Партыі камуністаў Беларускай, не пагадзіўся з пастаноўкай самога пытання. Маўляў, спачатку трэба разабрацца, што разумець пад словам "праваліўся"? На яго думку, *"Сацыяльны марш" у цэлым адбыўся"*, не зважаючы на тое, што народу на ім было *"крышку"* менш, чым на "Еўрапейскім". Разам з тым, трэба, аказваецца, зразумець, што мэтай акцыі *"не было раскручванне гэтай вулічнай дэмакратыі і вельмі моцнае павелічэнне колькасці ўдзельнікаў, для гэтага яшчэ не наспеў час, сёння сацыяльны градус яшчэ вельмі малы"*.

Вось так! Хай цяпер нехта паспрабуе заікнуцца пра вулічны ціск на рэжым, пра вулічныя інструменты барацьбы за ўладу. *"Галоўнае,* — запэўніў Сяргей Іванавіч, — *тое, што пачаўся працэс"* (здаецца, дзесьці мы нешта падобнае ўжо чулі). І паабяцаў, што 17 снежня па ўсёй краіне будзе арганізавана паўтары тысячы пікетаў. Хочацца верыць, што прагноз спраўдзіцца. Як спраўдзіцца прагноз сп.Калякіна аб тым, што пік сацыяльнай актыўнасці, сацыяльных выступаў прыйдзецца на сакавік—красавік будучага года.

**Паўла СЕВЯРЫНЦА,** аднаго з нефармальных лідэраў маладзёжнага руху ў Беларусі, палітыка з выразнымі праваxрысціянскімі перакананнямі, можна лічыць ідэйным антаганістам беларускіх камуністаў. У ацэнцы "Сацыяльнага маршу" Павел не вагаўся — *"гэта правал"*, арганізатары здолелі сабраць толькі частку партыйнага актыву і заўсёднікаў. На яго думку, такі вынік быў прадвызначаны яшчэ тады, калі акцыя каляндарна была набліжана арганізатарамі да гадавіны бальшавіцкага перавароту, прызначана на той самы дзень, калі ў Мінску сабраліся на з'езд камуністычныя кіраўнікі з усяго свету. А галоўнай рухаючай сілай Маршу былі пакліканы Сяргей Калякін, камуністы, увогуле левы блок. *"Асабіста мне нават у самым страшным сне не можа прысніцца, што я крочу ў калоне дэманстрантаў пад чырвонымі і расійскімі сцягамі, ды яшчэ на Бангалор... У маладзёжным асяродку, да якога я маю дачыненне, прыкладна, такое стаўленне да акцыі, якая адбылася"*.

**Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА,** лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі, даючы свае тлумачэнні адносна вынікаў "Сацыяльнага маршу", не стаў, як Севярынец, секчы праўду-матку, а элегічна патлумачыў, што беларусы ўсё яшчэ застаюцца ў межах *"кухоннага радыкалізму"*, таму актыўна не адгукнуліся на заклік выйсці на вуліцу 4 лістапада. "Сацыяльны марш" — гэта тое, што ляжыць на паверхні. Менавіта на яго ў першую чаргу звяртаюць увагу сродкі масавай інфармацыі. А дарэмна, бо яго — Анатоля Уладзіміравіча — *"больш цікавіць тое, што ўнутры"*, што робіцца ў фармаце сацыяльнай кампаніі. *"Гэта значыць тыя дзеянні, якія не вельмі ўзбуджаюць журналістаў, але якія зарыентаваны на працу з людзьмі"* (збор подпісаў, правядзенне пікетаў, распаўсюджванне ўлётак і г.д.).

**Вінцук ВЯЧОРКА,** старшыня партыі БНФ, у адрозненне ад Анатоля Лябедзькі не капаў у глыбіню, выказваўся без усялякай эратычнай двухсэнсоўнасці, але гнутка і надзіва салідарна з лідэрам камуністаў. Ён адразу прапанаваў не ўжываць тэрмін *"правал"* да акцыі, на якую збіраецца нават тысяча чалавек, бо, калі ў якой-небудзь Маскве на акцыю збіраецца 500 чалавек, то *"пра гэта трубяць усе медыі і гэта разлядаецца як падзея"*. Аргументацыя, безумоўна, непахісная. Відаць, адчуваючы гэта, сп.Вячорка ўсё ж дадаў: *"Марш быў параўнальна нешматлікім. Справа ў тым, што непалітызаваныя людзі, якіх закранулі сацыяльныя праблемы пасля змены сацыяльнай палітыкі ўлады, яшчэ гэтага не адчулі. Рэальна яны адчуюць новую эканамічную сітуацыю ўзімку і ўвесну"*. Тут міжволі просіцца пытанне: калі ўсе так добра разумеюць, што сацыяльны ўздым прыйдзецца на вясну, навошта было агарод гарадзіць 4 лістапада? Ці, можа, камусьці хацелася дагадзіць саюзнікам-камуністам, якія святкавалі юбілей кастрычніцкага перавароту?

### Вінавата «лепшае» жыццё

**Аляксандр БУХВОСТАЎ,** вядомы прафсаюзны дзеяч, сябра прэзідыума палітсавета Каардынацыйнай рады дэмакратычных сіл, гэтую версію не пацвердзіў. Затое, як і Сяргей Іванавіч Калякін, майстэрствам палеміста "бліснуў", калі паспрабаваў пераканаць, быццам чорнае, пры пэўных умовах, можа быць прызнана белым. Відаць, зыходзячы менавіта з гэтага тэзіса, ён заявіў: *"Я не лічу, што "Сацыяльны марш" праваліўся"*. Проста людзі, якія былі на "Еўрапейскім маршы", у сваёй большасці на "Сацыяльны марш" не прыйшлі. І патлумачыў прычыну гэтага *"пэўнымі разыходжаннямі ўнутры кааліцыйных сіл"*. На думку Аляксандра Іванавіча, некаторыя апазіцыйныя лідэры памылкова палічылі, што "Сацыяльны марш" праводзяць "левыя", а ў Еўропу ідуць "правыя". Сяргей Калякін, між іншым, узяў актыўны ўдзел у "Еўрапейскім маршы", а вось *"лідэры некалькі іншай арыентацыі"* нават не знайшлі час, каб прыйсці на "Сацыяльны марш". Па слушным заключэнні сп.Бухвостава — усё гэта праявы ўнутранай хваробы апазіцыі.

**Мікола СТАТКЕВІЧ,** адзін з лідэраў беларускай сацыял-дэмакратыі, каардынатар ствараемага "Еўрапейскага руху", патлумачыў, што асабіста ён прытрымліваецца, так бы мовіць, традыцыйнай арыентацыі, якая абумоўлена гістарычнай скіраванасцю Беларусі ў бок еўрапейскіх каштоўнасцяў, а *"некалькі іншай арыентацыі"* прытрымліваюцца якраз тыя, хто глядзіць на ўсход. Чаму "Сацыяльны марш" праваліўся? Таму, што людзі не адчувалі яго своечасовасць. Зараз не выбары, не рэферэндум, не напружаная сацыяльная сітуацыя. *"Зараз "Сацыяльны марш", на думку тых, хто яго праігнараваў, не патрэбны"*. З іншага боку, праблема таксама ў арганізатарах, сярод якіх значная роля належала не тым, хто імкнецца ў Еўропу, а камуністам. Між тым, большасць дэмакратычнага актыву ў Мінску і рэгіёнах зарыентавана на Еўропу. Зразумела, што падчас "Еўрапейскага маршу" ў гэтай большасці была моцная матывацыя выходзіць на вуліцу, а падчас "Сацыяльнага маршу" — наадварот.

**Анатоль ЛЯЎКОВІЧ,** выконваючы абавязкі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), не палез, як прынята казаць, у бутэльку, а адразу прызнаўся, што для яго не быў нечаканым больш чым сціплы вынік "Сацыяльнага маршу". Спрактыкаваны палітык з філасофскім ухілам патлумачыў гэта тым, што *"сёння беларускі электарат жыве лепей, чым пры савецкай уладзе. Таму чакаць нейкага сацыяльнага пратэсту не выпадае"*. Пакінем словы аб лепшым жыцці на сумленні Анатоля Іосіфавіча. Адзначым толькі, што яго назіранні над беларускай рэчаіснасцю вартыя таго, каб іх агучылі дзяржаўныя СМІ.

**Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ,** экс-кандыдат у прэзідэнты, лідэр ствараемага грамадскага руху "За свабоду", расцаніў правал акцыі 4 лістапада як заканамерны вынік памылкі арганізатараў мерапрыемства (у асноўным левага крыла кааліцыі). *"Яны палічылі, што падняць людзей на сацыяльны пратэст не больш цяжка, чым памахаць чароўнай палачкай"*. Інакш кажучы, не хапіла цвярозай ацэнкі сітуацыі. Безумоўна, у краіне спеюць вялікія сацыяльныя праблемы: растуць цэны, зарплаты і пенсіі адстаюць ад тэмпаў інфляцыі, ільготы ліквідуюцца. Аднак сацыяльнага напружання ў грамадстве пакуль няма. Спадар Мілінкевіч не без прыкрасці адзначыў: *"Калі яшчэ летам планаваліся абодва Маршы, я папярэджваў, што не варта праводзіць дзве акцыі амаль адначасова, мы не здолеем сабраць вялікую колькасць народу. Працэс пайдзе пад ухіл, людзей можа ахапіць апатыя, недавер. Таму я заклікаў не праводзіць лістападаўскі "Сацыяльны марш", перанесці яго на больш позні тэрмін. Прыйдзе час, людзі могуць самі выйсці на вуліцу, без нас"*.

***

Усе апазіцыйныя палітыкі, калі іх слухаць і разглядаць паасобку, — больш ці менш разумныя, абачлівыя, празорлівыя, усе па-свойму пераканаўча тлумачаць жыццёвыя праблемы. А калі іх слухаць і разглядаць разам як нейкі агульны мазгавы цэнтр дэмакратычнага руху краіны, адразу ўзнікае пытанне пра дыягназ. І просіцца выснова аб тым, што гэтаму руху, магчыма, у першую чаргу неабходна мацаваць калектыўны розум. Інакш людзі сапраўды пойдуць на вуліцы *"без нас"*, а дакладней — без іх. І тады пачнецца зусім іншая гісторыя, у якой ужо не будзе месца сённяшнім прафесійным змагарам за дэмакратыю.

*(Заканчэнне ў наступным нумары.)*

УВАГА!

## У Беларусі таксама будуць выбіраць дэпутатаў Дзярждумы Расіі

**2 снежня ў Беларусі будуць адкрыты сем выбарчых участкаў па выбарах дэпутатаў Дзяржаўнай думы Расіі. Пра гэта паведаміў БелаПАН сакратар Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік.**

Паводле яго слоў, размяшчэнне ўчасткаў ужо ўзгоднена з мясцовымі органамі ўлады. У прыватнасці, выбарчыя ўчасткі будуць створаны ў Мінску (Старавіленскі тракт,41, Палац дзяцей і моладзі), Віцебску (вул.Маякоўскага,1, гарадскі Цэнтр культуры), Гомелі (вул.Ланге,17, Абласны грамадска-культурны цэнтр), Магілёве (вул.Ленінская,61, Ліцэй Беларуска-Расійскага універсітэта), Брэсце (вул.Пушкінская,10, генеральнае консульства Расіі), Гродна (вул.Дзяржынскага,1, Гарадскі дом культуры), а таксама ў гарадскім пасёлку Клецк-2 (клуб воінскай часці), дзе кампактна жывуць расійскія вайскоўцы.

Галасаванне на гэтых участках будзе праходзіць толькі ў дзень выбараў, 2 снежня, з 8.00 да 20.00.

Наведаць участкі для галасавання змогуць грамадзяне Расіі, якія пастаянна жывуць або часова знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Для ўдзелу ў галасаванні неабходна мець дакумент, які сведчыць асобу і расійскае грамадзянства. Тыя, хто часова знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, павінны паказаць таксама адмацавальнае пасведчанне.

Паводле звестак МУС, у Беларусі пастаянна жывуць больш за 70 тыс. расійскіх грамадзян, з іх амаль палова знаходзіцца на консульскім уліку.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

## Неужели не дрогнет рука?

### Открытое письмо президенту А.Г.Лукашенко

Уважаемый Александр Григорьевич!

Обращаюсь к Вам от имени многих бывших несовершеннолетних узников фашизма, проживающих в Витебске и области. Обращаюсь через газету по двум причинам. Не верю, что это письмо, отправленное мною накануне почтой, попадет Вам лично в руки.

Хочу напомнить, что в 1988 году на заседании Верховного Совета СССР был поднят вопрос о беззащитной категории граждан — детях, находившихся в фашистских концлагерях, гетто и других местах принудительного содержания. По предложению советского детского фонда имени В.И.Ленина Совет Министров СССР 6 октября 1989 г. принял постановление о распространении ряда льгот, которыми пользовались участники Великой Отечественной войны, на бывших несовершеннолетних узников фашизма. Закон с соответствующей статьей был принят и в Беларуси. Этот правовой акт введен в действие с 1 января 1993 г. Вероятно, Вы, Александр Григорьевич, тоже голосовали за тот закон. Недаром ко всем знаменательным датам 1999—2005 годов мы, бывшие узники, получали от Вас поздравления, от Вашего имени награждались юбилейными медалями в честь Победы.

И вот теперь нас хотят лишить не столь уж больших, не слишком обременительных для казны льгот.

Мы в детстве познали войну, ее ужасы снятся нам до сих пор.

Мы принадлежим к поколению, которое возрождало изувеченную войной Беларусь, строило города, заводы. Самому молодому из нас уже за 70, а рабочий стаж — не менее 40 лет. Наше здоровье подорвано войной и трудом на благо родины. И вот накануне 2008 года мы получаем новогодний "подарочек" — отмену льгот. Хотелось бы посмотреть в глаза тем, кто работал над законом, отнимающим у нас немногочисленные льготы. Ведь нас осталось в живых не более 100 тысяч по всей Беларуси. Ни в России, с которой у нас вроде бы союзное государство, ни в братской Украине до отмены льгот не додумались.

Мы — последние живые свидетели страшной войны и, выйдя на пенсию, продолжаем трудиться, проводить работу по воспитанию молодежи в духе патриотизма и ненависти к войне, чтобы новым поколениям соотечественников не довелось испытать то, что пережили мы.

Занимаемся также увековечением памяти погибших воинов-освободителей, безвинно уничтоженных военнопленных, мирного населения.

По нашей инициативе разработан проект благоустройства бывшего витебского лагеря смерти "5-й полк", где было уничтожено более 100 тысяч человек. В 1998 году решение о благоустройстве территории бывшего лагеря смерти принял Витебский горисполком, а в 2004 году эта тема прозвучала во время Вашей пресс-конференции с российскими журналистами.

Мы приглашали Вас, Александр Григорьевич, посетить это скорбное место в один из визитов на Витебщину.

В ожидании Вашего приезда на месте гибели узников концлагеря мы установили памятный крест, который тогда же был освящен митрополитом Филаретом.

Вы, Александр Григорьевич, родились через 9 лет после войны, однако, мы уверены, успели почувствовать ее отзвук, ее леденящее душу дыхание.

Именно поэтому и надеемся, что Вы подумаете о моральных издержках отмены льгот бывшим несовершеннолетним узникам фашизма...

**Владимир Александрович РИЗО,**
**член объединения бывших узников концлагеря "5-й полк" (KL-313SD), бывший узник двух фашистских лагерей, член правления Витебской областной организации ОО "Белорусская ассоциация несовершеннолетних узников фашизма", пенсионер, инвалид II группы.**

КАШАЛЁК

## Павышэнне цэн — гэта, як высвятляецца, сацыяльная абарона нас з вамі

Рознічныя цэны на малочныя прадукты паніжанай тлустасці (малако і кефір тлустасцю да 1,5 працэнта, смятану тлустасцю да 15 працэнтаў, тварог тлустасцю да 5 працэнтаў) павышаны да 6 працэнтаў. На малако, кефір, смятану і тварог больш высокай тлустасці — да 14,8 працэнта, на ялавічыну і свініну — да 8 працэнтаў. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства эканомікі №201 "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 2007 г. №56".

У аналагічных памерах прадугледжана павелічэнне і гранічных адпускных цэн. Паводле інфармацыі Мінэканомікі, дадзеная пастанова прынята ў сувязі з павелічэннем закупачных цэн на прадукцыю жывёлагадоўлі і ў мэтах кампенсацыі падаражання кошту асноўнай сыравіны, якая займае ў структуры сабекошту малочнай і мясной прадукцыі ў сярэднім больш за 70 працэнтаў, а таксама недапушчэння пагаршэння фінансавага становішча перапрацоўчых прадпрыемстваў.

У міністэрстве таксама адзначаюць, што павелічэнне цэн увязана з прынятымі ўрадам з 1 лістапада папераджальнымі мерамі па ўзмацненні сацыяльнай абароны насельніцтва, якія прадугледжваюць павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду з 65 да 70 тысяч рублёў, а таксама павышэнне працоўных пенсій на 9,3 працэнта.

Вось дзякуй, адной рукой далі грошы, а другой — забралі.

БЕСПРЭЦЭДЭНТНЫ ВЫПАДАК

## Віцебскі прадпрымальнік Анатоль Ягораў уласнаручна зруйнаваў свой двухпавярховы цагляны дом

Яшчэ ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя віцябчанін **Анатоль Ягораў** набыў у карыстанне зямельны ўчастак. Кавалак зямлі памерам 1242 квадратныя метры знаходзіцца ў прэстыжным раёне Віцебска — ля самай прыбярэжнай паласы Заходняй Дзвіны.

У хуткім часе Ягораў распачаў будаўніцтва на ўласнай зямлі — захацеў пабудаваць тут дом. Закупіў і прывёз на месца будоўлі неабходныя матэрыялы, і, як кажуць, справа пайшла.

*"Будоўля была скончана недзе на пачатку 2000-х гадоў,* — расказаў "Народнай волі" Анатоль Ягораў. — *Будынак атрымаўся вельмі прыгожым — двухпавярховы дом з чырвонай цэглы памерам 8 на 7"*.

Некаторыя гараджане, якія бачылі дом-прыгажун, зразумела, зайздросцілі і нават вынеслі свой вердыкт: дом на самым беразе Заходняй Дзвіны дазволілі пабудаваць чалавеку з неблагімі сувязямі — ці то чыноўніку, ці то сілавіку. Праўда, ні да чынавенства, ні да сілавікоў гаспадар зямельнага ўчастка ніякага дачынення не мае. Зямля, на якой быў пабудаваны дом, належыць грамадзяніну Ягораву. Гэта вынікае з рашэння Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта, дзе напісана: *"На падставе дагавора куплі-продажу ад 14.08.1996 прадаставіць Ягораву Анатолю Пятровічу зямельны ўчастак плошчай 1242 квадратныя метры ў пажыццёвае ўладанне для абслугоўвання існуючага жылога дома"*.

Тут варта адзначыць, што на зямлі, якую набыў Ягораў, раней стаяў дом, дзе пражывалі іншыя гаспадары. Новы гаспадар вырашыў так: раз раней тут можна было будавацца, то ніякіх праблем з тым, каб пабудаваць яшчэ адзін дом, не ўзнікне. Ягораў узяўся за справу. І ўжо ў 2003 годзе кампетэнтныя органы прыслалі віцебскаму прадпрымальніку дакумент, дзе гаварылася, што гэты двухпавярховы цагляны дом адпавядае ўсім санітарна-тэхнічным патрабаванням і гатовы для перадачы ў эксплуатацыю...

Усё было б добра, і жыў бы Ягораў у новым шыкоўным доме, калі б не... Калі б у справу па звычцы не ўмяшаліся правяраючыя органы. Нядаўна на сайце Камітэта дзяржкантролю было размешчана паведамленне аб зносе асабняка, пабудаванага незаконна на правым беразе Дзвіны. Вы правільна здагадаліся, размова ідзе якраз пра дом Анатоля Ягорава.

*"Гэтыя самыя кампетэнтныя органы і далі каманду знесці дом,* — распавядае Анатоль Ягораў. — *Я пагараваў-пагараваў ды і вырашыў знесці дом уласнаручна, не чакаючы, пакуль яго бульдозер руйнаваць прыедзе"*.

Зразумела, гаспадару было шкада развітвацца з самастойна пабудаваным домам.

*"Колькі грошай я ў яго ўклаў, ужо і не памятаю, але, самі разумееце, сума не маленькая,* — гаворыць Ягораў. — *Іншага выхаду, як самому па цагліне разабраць дом, у мяне і не было. Бо калі б мой дом зносілі па ўсіх правілах, то мне б за гэта яшчэ давялося і заплаціць. А так сам разабраў — і грошы зэканоміў"*.

Карацей, калі на ўчастак да Анатоля Ягорава прыехала тэхніка, каб зруйнаваць будынак, то руйнаваць ужо не было чаго...

Наколькі нам вядома, Ягораў не збіраўся аспрэчваць рашэнне кампетэнтных органаў у судах. Ці ведаў аб бесперспектыўнасці судовых цяжбаў, ці яшчэ што, але тым не менш прадпрымальнік застаўся без дома.

Цікава, а да асабнякоў тых жа віцебскіх высокіх начальнікаў і супрацоўнікаў КДК будзе такая ж пільная ўвага?

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**
**Уладзімір ЖЫГУЛОЎ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛІСТАПАДА 2007 г.

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ!

# Палігоны варварства і карупцыі



У часы СССР на Пастаўшчыне размяшчалася шмат вайсковых злучэнняў і часцей, у тым ліку — ракетная дывізія, два авіяцыйныя палкі з аэрадромам 1 класа і часцямі забеспячэння, — наўрад ці быў у Беларусі другі райцэнтр з такой канцэнтрацыяй вайскоўцаў і збудаванняў вайсковага прызначэння. Акрамя вышэйпералічаных аб'ектаў, у Паставах або побач знаходзіліся ракетная база і два жылыя мікраараёны для сем'яў ваеннаслужачых.

І ўсё гэта адным махам зрабілася нічыйным і было перададзена мясцовым органам улады, якія пачалі гаспадарнічаць на тэрыторыі, адкуль сышлі вайскоўцы.

Збудаванні, прынятыя на баланс раённага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, выкарыстоўваюцца ў асноўным правільна, рацыянальна. Але большая частка вайсковай маёмасці пакрысе стала перадавацца ў арэнду камерцыйным структурам, а частка, магчыма, была выкуплена імі. Кажу "магчыма", бо дакладна не ведаю і нідзе даведацца не змагу: па чутках, раздача і распродаж адбыліся патаемна ад грамадскасці, а таму спарадзілі шмат плётак і версій, адна з якіх утрымлівала меркаванне пра вялікія сумы хабару чыноўнікам за бязвыплатную перадачу будынкаў ды іншай маёмасці.

Тым больш што значная частка перададзенага камерцыйным структурам вайсковага дабра выкарыстоўвалася новымі ўладальнікамі не па-гаспадарску.

Напрыклад, тэхнічная зона ракетнага палка з шэрагу вялізных мураваных будынкаў па ініцыятыве тадышняга старшыні райвыканкама Ванды Януковіч была перададзена сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву "Навасёлкі-Лучай" на чале з Алегам Валодзькам. Паводле загаду старшыні былі наняты беспрацоўныя, якія за натураплату варварскі, як ворагі, разбурылі будынкі, сарваўшы з іх дах, разнеслі па цагліне муры, выламалі шыбы.

Цяпер немагчыма без болю бачыць тыя гмахі, на капітальны рамонт якіх спатрэбяцца вялікія выдаткі.

Вось куды трэба было зазірнуць з грунтоўнай праверкай супрацоўнікам Дзяржкантролю і пракуратуры!

Амаль тое ж самае адбылося з аэрадромам, з якога выцягнулі і скралі бетонныя пліты, а тэхнічныя і службовыя збудаванні райвыканкам перадаў камерцыйным структурам практычна задарма, пад выглядам апусцелых, зношаных і ні да чаго не прыдатных. У выніку гэтай дзіўнай здзелкі новыя гаспадары прасторных, дыхтоўна ўзведзеных будынкаў карыстаюцца імі бясплатна, бо разлічваюцца толькі за арэнду зямлі. Ну як тут паверыць, што такі шыкоўны падарунак быў зроблены бескарысліва? Тым больш што перадача гэтай маёмасці арандатарам адбывалася, як і ўсе папярэднія, патаемна.

Карацей кажучы, ёсць чым пацікавіцца кампетэнтным органам. І не толькі ў камерцыйных, але і ў дзяржаўных структур. Шмат размоў ідзе, напрыклад, пра тое, як нядбайна выкарыстоўвае колішнюю вайсковую маёмасць арганізацыя, што нядаўна звалася "Райсельгасхімія", а цяпер набыла нейкі новы, малазразумелы статус.

Пакуль перадача вайсковай маёмасці камерсантам і характар яе выкарыстання новымі гаспадарамі застаюцца працэсамі, не празрыстымі для грамадскасці, народ заканамерна будзе лічыць, што без нейкіх службовых злоўжыванняў гэтая справа не абыходзіцца.

Цяпер у прадпрымальнікаў пачынаецца другі этап выкарыстання арандаванай маёмасці: танны выкуп або атрыманне яе бясплатна ў прыватнае карыстанне.

Яно, здавалася б, і лагічна, і добра, калі гэтую маёмасць інакш выкарыстаць нельга. Аднак, на мой погляд, і выкуп, і бясплатную перадачу трэба рабіць галосна, адкрыта, шляхам конкурсу прэтэндэнтаў. А інакш чарговая хваля здзелак улады з мясцовымі прадпрымальнікамі пераўтворыць колішнія вайсковыя гарадкі і палігоны ў палігоны варварства і карупцыі.

**Уладзімір БАРОЎКА,**
**ветэран Узброеных сіл РБ.**

*г.Паставы.*

ЧИТАТЕЛЬ — ГАЗЕТА

# ...Друг другу руку протянуть

Внимательный читатель "Народной воли" знает: имея собственную позицию, газета тем не менее не претендует на роль верховного судии, вещания истины в последней инстанции. Как и положено демократическому изданию, она предоставляет возможность высказывать разные точки зрения, учитывает широкий спектр мнений в обществе.

На страницах нашей газеты нет "неприкосновенных" публикаций. Зацепило читателя за живое, вызвало одобрительный или критический отзвук — пожалуйста, высказывайся, только подкрепляй свои суждения весомыми аргументами и убедительными фактами.

Оживленная дискуссия, например, прошла недавно по волнующим проблемам пенсионного обеспечения в стране и отмены льгот многим категориям граждан, в ходе которой читатели заинтересованно спорили и дополняли друг друга, высказывая порой полярные мнения. Или совсем свежий пример: в одном из последних номеров нашей газеты помещено объемное выступление известного политика, а вслед — остро полемический отклик на него философа и публициста... Подобная практика свободы высказываний, которая, увы, отсутствует в официальных СМИ, — привычная норма для нашей газеты.

Все это можно отнести и к истории с публикацией статьи "Поколение, которого не стало" (№№ 29—30 за 22 февраля с.г.), принадлежащей перу Ольги Александровны Нехай. Автор — уважаемый человек, участница Великой Отечественной войны, известная активной общественной деятельностью как руководитель Белорусского общественного объединения бывших узников фашизма "Лёс", а также многолетней плодотворной научно-педагогической и воспитательной работой с молодежью как профессор Минского государственного лингвистического университета. Ольга Александровна прошла через огромные жизненные испытания в молодые, опаленные войной годы. Познала на себе ужасы гитлеровской оккупации, душевные и физические муки в Минской тюрьме, куда ее бросили фашисты за связь с партизанами, а затем — на рабских работах в концлагере на территории Германии. Изведала неизбывную трагедию — потерю маленького сына и любимого мужа. А еще — тяготы и переживания послевоенных лет, когда в СССР к узникам нацизма относились с подозрительностью и недоверием. Эта женщина разделила нелегкую судьбу многих соотечественников своего поколения, но выстояла, одолела, казалось бы, неодолимое и состоялась как личность, значимый в обществе человек.

С душевной болью пишет Ольга Александровна о несправедливостях, омрачающих жизнь бывших узников концлагерей. Ни прежде, ни даже в сегодняшней, уже суверенной Республике Беларусь, в отличие от соседних России и Украины, нет закона о государственной защите и поддержке всех жертв гитлеровского нацизма. (Заметим: определенные законодательством льготы, ныне уже отмененные, имели прежде бывшие *несовершеннолетние* узники; *совершеннолетние* же изначально обделены опекой государства.)

Из статьи можно сделать вывод, что подобное отношение к этой категории граждан чревато не только психологическим и материальным ущербом для состарившихся и потерявших здоровье людей, но и для морально-духовного состояния общества.

С этим невозможно спорить. И никто не спорит. Но вот вторая часть публикации, где автор рассуждает о поколении бывших малолетних узников, вызвала решительное несогласие со стороны некоторых из них. Свою точку зрения на сей счет в своем письме в редакцию изложили члены Минской городской организации Общественного объединения бывших несовершеннолетних узников концлагеря "Озаричи" Георгий Иванович **Ковальчук,** Федор Антонович **Верас** и Николай Иванович **Реутский.** Они посчитали весьма обидными для себя и своих сверстников — детей войны, чудом выживших в лагере смерти, оценки, высказанные Ольгой Нехай. (Письмо под заголовком "Вот и уравняли нас, узников фашизма, на нулевой отметке. Вы довольны, Ольга Александровна?" напечатано в №№ 159—160 за 5 октября с.г.)

Теперь, уже на эту публикацию в газете, обиделась Ольга Александровна, потребовав "сатисфакции" — опровержения перечисленных ею положений статьи бывших озаричских лагерников. Что ж, постараемся ответить ей, придерживаясь объективности и того порядка вопросов, которые обозначила сама О.Нехай. Итак:

**О.Н.** *"1.Как я "втоптала в грязь" бывших несовершеннолетних узников фашизма?"*

**Ред.** Авторов вышеназванной статьи — Г.Ковальчука, Ф.Вераса и Н.Реутского — больно задели огульные негативные высказывания руководителя общественного объединения "Лёс" по адресу некогда самых беззащитных жертв войны. К примеру, обвинения — ни много ни мало — *"в политической близорукости бывших несовершеннолетних узников и отсутствии понимания доблести народа",* в том, что *"дети не могли еще осознать достоинства старшего поколения", "ни один несовершеннолетний узник не вступился за свою мать, отца, за память о родителях..."* и т.д. Гневный риторический вопрос *"Какое историческое значение этих детей, достигнувших пожилого возраста?"* воспринят ими как перечеркивание смысла всей жизни уцелевших в смертельном аду малолеток, большинство которых впоследствии так же, как и О.Нехай, сумело вырасти достойными людьми и вместе со старшими, отстоявшими Родину в боях, сделать немало хорошего.

*"Нельзя умалчивать исторические факты",* — пишет Ольга Александровна, и с этим нельзя не согласиться.

**О.Н.** *"2.Почему Вы в вашей статье "втоптали в грязь" мою общественную деятельность и мою личность?"*

**Ред.** Общественная деятельность Ольги Нехай в статье бывших озаричских узников не затрагивается.

**О.Н.** *"3.Доказать, когда я "принимала участие в конкурсе красоты в концлагере".*

**Ред.** Вот здесь признаем без обиняков: в интерпретации Г.Ковальчука, Ф.Вераса и Н.Реутского одного из эпизодов лагерной жизни, взятого ими из книги Ольги Нехай "Вехи памяти моей жизни" (Минск, 2004), допущена серьезная ошибка. Приводим фрагмент из названной (к слову, очень интересной) книги (стр.59): *"По лагерю пронесся слух, что вестарбайтеры готовят подарок для самой лучшей девушки в концлагере... За несколько дней до освобождения ребята вручили подарок такой девушке. Ею оказалась Я. Подарок был трогательным..."* Как видим, "конкурса красоты" со всей его атрибутикой в лагере не было, да и не могло быть. Было иное: дружеский жест участия со стороны товарищей по несчастью — вестарбайтеров...

Редакция приносит глубокие извинения уважаемой Ольге Александровне и высказывает искреннее сожаление о том, что авторы публикации некорректно, в недопустимой форме интерпретировали приведенный в книге факт.

**О.Н.** *"4.Доказать мое участие в отмене льгот".*

**Ред.** Это трудно сделать, поскольку тема "участия" в тексте статьи "Вот и уравняли нас..." отсутствует.

...Мы честно и со всей убежденностью ответили на Ваши, уважаемая Ольга Александровна, вопросы. Хотя допускаем, что не все ответы могут Вам понравиться, как, впрочем, и оппонирующей Вам стороне.

Понимаем, как больно задевает несправедливо брошенное или недостаточно взвешенное слово. Задевает каждого, а что уже говорить о людях старших поколений, изведавших страшное лихолетье и до сего дня страдающих от незаживших ран? Но задумаемся: разве не объединяет всех, прошедших неимоверные испытания, в том числе — совершеннолетних и малолетних узников, общая беда и боль, общая память о великой народной трагедии? И — ответственность за мирное будущее своей земли, за судьбы детей, внуков и правнуков. Не лучше ли, сознавая это, подняться над взаимными упреками и обидами (порой, похоже, беспочвенными), преодолеть стену недопонимания? И — протянуть навстречу друг другу руки, что и следовало бы ожидать от благородных и великодушных (в этом никто не сомневается) людей, заслуженных перед жизнью и страной.

Желаем участникам этого спора, как и всем-всем прошедшим через войну, доброго здоровья и долгих радостных лет, душевного спокойствия и не подвластной годам жизненной энергии, семейного благополучия и надежных друзей. Пусть ваш богатый жизненный опыт служит ориентиром для тех, кто продолжит ваш путь.

**С уважением —**

**редакция**
**"НАРОДНОЙ ВОЛИ".**

ОБИДА

# Вот оно какое, депутатское «внутреннее убеждение»...

18 сентября 2007 г. мы, группа граждан, пришли на прием к депутату Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь по городу Жлобину и Жлобинскому району Нине Августовне Каберник. Дождавшись своей очереди, вошли в комнату для приема посетителей. Мы — это Марат Степанович Афанасьев, ветеран труда Белорусского металлургического завода, пенсионер; Анатолий Иванович Степаненко, также ветеран этого завода, пенсионер; Валерий Владимирович Рыбченко, бывший работник Белорусского металлургического завода; Валентин Алексеевич Евзрезов, пенсионер.

Основным нашим вопросом к депутату Н.Каберник было: ее мотив голосования в Палате представителей за отмену социальных гарантий и льгот инвалидам, пенсионерам, студентам? На наш прямой вопрос, почему она, полномочный представитель жителей города и района в парламенте страны, поддержала этот антигуманный закон, Нина Августовна ответила: мол, голосовала "по своему внутреннему убеждению".

Вот мы и дождались! Депутат парламента *"по своему внутреннему убеждению"* голосует против самых незащищенных, беспомощных людей в нашем *"социально- ориентированном"* государстве. Нажимает на кнопку за закон против тех, чьим именем и прошла и кого обещала всячески защищать.

Н.Каберник выдвигалась в парламент от коллектива Белорусского металлургического завода, но является представителем всех жителей города и района. Почему же за три года депутатства в Палате она не нашла времени для открытых встреч с нами? В Жлобине немало вместительных залов, где могли бы пройти такие встречи — Дом культуры, Дворец культуры металлургов, большая арена нового Ледового дворца, например... Но, увы, ничего подобного с 2004 г. не было. Приемы посетителей в райисполкоме или выступления перед группами специально подобранных людей на заводе вряд ли могут, считаем, называться полноценным и открытым разговором, ибо эти люди попросту боятся заявить о нарушениях своих прав. Запуганные контрактной системой, они не рискуют в присутствии начальства задавать *"неудобные"* вопросы: наниматель может расторгнуть контракт безо всякого объяснения причин.

...Не поддержала депутат Н.Каберник наше предложение по отмене кабальной контрактной системы найма на работу. Она вовсе не считает, что эта система превратила работников страны в бессловесных, бесправных рабов, зависимых от каприза и произвола начальства. И прямо заявила, что контрактная система нужна для того, чтобы избавиться от *"невменяемых"*.

Вы только посмотрите, что про нас говорят и кем нас считают! Решают, кто из нас *"вменяемый"*, ведут себя как хозяева жизни, а мы и слова сказать не моги...

На Белорусском металлургическом заводе два депутата: Н.Андрианов — генеральный директор РУП "БМЗ", депутат Гомельского областного совета, и А.Коледа — председатель заводского профсоюза, депутат Жлобинского районного совета — слабо отстаивают интересы избирателей, не защищают их трудовые и социальные права.

Да и вообще, разве можно так относиться к конституционным правам граждан? С такими *"внутренними убеждениями"* доверие людей не завоюешь. Носители подобных убеждений оставляют в неприкосновенности собственные привилегии и хорошие зарплаты, весомые пенсии. При этом горестно вздыхают о "непосильной" нагрузке на бюджет наших убогих пенсий. Вам бы, дорогие (для бюджета и наших кошельков), получить пенсию *"на общих основаниях"*.

Убежден: никаких *"господских"* привилегий не должно быть. Никакое переписывание Конституции не может лишить народ права самому распоряжаться своей жизнью, решать свою судьбу.

**Анатолий Иванович**
**СТЕПАНЕНКО,**
**ветеран труда Белорусского**
**металлургического завода.**

*г.Жлобин.*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

## *Проста напішыце заяву*

*Я прапісана ў Ракаве, але жыву і працую ў Мінску. Ці магу я звяртацца па дапамогу па месцы свайго жыхарства ў Мінску і што для гэтага патрэбна?*

**Людміла ВАЎЧКОВА.**

Як нам патлумачылі ў Міністэрстве аховы здароўя, вы, паважаная Людміла, маеце права звяртацца ў мінскую паліклініку па медыцынскую дапамогу. Для гэтага вам патрэбна падаць пісьмовую заяву на імя галоўнага ўрача паліклінікі аб часовым замацаванні для аказання медыцынскай дапамогі.

## *Піва — можна*

*Я хутка паеду ў Чэхію. І сябры заказалі прывезці адтуль піва, кажуць, што цяпер яго можна ўвозіць без усялякіх абмежаванняў. Ці так гэта?*

**Вадзім АБАДЗЕЙ,**
**г.Мінск.**

Калі вы будзеце вяртацца ў нашу краіну пасля 22 снежня, то можаце ўвозіць піва колькі заўгодна. Менавіта з гэтага дня ўступаюць у дзеянне новыя правілы ўвозу тавараў для асабістага карыстання. Імі, сапраўды, знятыя абмежаванні на ўвоз піва, якое ўтрымлівае не больш за 7% алкаголю.

Але не забывайцеся, што агульная вага вашага багажу не павінна перавышаць 35 кілаграмаў (да 22 снежня — 50 кілаграмаў).

АДКРЫТЫМ ТЭКСТАМ

# Не смуродзьце!

Мабыць, ужо больш за дзесяць гадоў, як я перастаў глядзець БТ, апроч трансляцый спартыўных спаборніцтваў. А вось неяк выпадкова, як на грэх, пераключаючы тэлеканалы, натрапіў на выступленне аднаго са штатных палітычных тэлеаглядальнікаў. Прозвішча яго не ведаю, ды гэта і не так важна. Іх там нямала, і ўсе яны на адзін капыл. Паслухаўшы крыху, узгадаў анекдот з савецкіх часоў.

Прыходзіць у адзін дзіцячы садок прадстаўнічая камісія правяраць стан выхаваўчай работы. Пахадзілі, панюхалі — усё цудоўна: дзеткі, бы тыя лялечкі, — ветлівыя, не па ўзросце развітыя, ведаюць вершы пра правадыроў краіны і, канешне ж, пра дзядулю Леніна. Але што гэта за камісія, што прасядзела некалькі дзён у садку і не знайшла ніякіх недахопаў! Такога быць не можа. Раптам адна з правяраючых, самая пранырлівая, узрадавалася: гвалт, няма нагляднай агітацыі!

Загадчыца садка, выхавацелькі пачалі прасіцца: дзеткі ж яшчэ нічога ў палітыцы не разумеюць ды і чытаць не ўмеюць. Камісія няўмольна: напішыце на даступнай для іх мове. Тэрмін — да заўтрашняга ранку! Кропка! Цэлую ноч небаракі супрацоўніцы садка, ад загадчыцы да прыбіральшчыцы, не спалі, думалі. А калі раніцай камісія прыйшла, каб праверыць выкананне даручэння, то ўбачыла над дзвярыма ля ўваходу ў будынак лозунг: "Мір — няка (нешта смачнае), вайна — бяка, Амерыка — кака!"

Нечым падобна было і выступленне гэтага аглядальніка. Чаго там толькі ні было на адрас ЗША: і што долар паваліўся і падняцца яму вельмі цяжка, валяецца прама пад нагамі, і доўг амерыканскай дзяржавы зашкаліў, і эканоміка ўся вось-вось абрынецца ў бяздонне. Не хапала толькі аднаго: просьбы амерыканцаў даць ім палітычны прытулак у шчаслівай, стабільнай, заможнай, багатай і сытай Беларусі з яе ўзорным дэмакратычным ладам. Іншага выйсця, калі верыць гэтаму вешчуну, у амерыканцаў проста няма. А словы, а пафас! Пэўне, ураган "Катрына", што заліў вялікі горад Новы Арлеан, не прынёс туды столькі бруду, колькі было выліта яго з вуснаў гэтага спадара "государева" аглядальніка. Шкада мне стала няшчасных янкі. Як яны там толькі выжываюць, чаму яны там усё яшчэ сядзяць! Ці не пара ім адмовіцца ад сваёй нікому не патрэбнай валюты і абмяняць яе на "цвёрдыя" беларускія рублі? Толькі дзе? Ты, спадар агітатар, бачыў дзе-небудзь, каб валяўся пад нагамі амерыканскі долар? Не, не бачыў, А вось я бачыў, як таптаілі нагамі беларускіх зайцоў на падлозе ў туалеце.

Каментарый быў вельмі эмацыянальны. Каб усё сказанае гучала больш пераканаўча, тэлевядучы прыводзіў неабвержныя довады — цытаты з амерыканскіх жа выданняў. А наш абывацель сядзіць ля тэлевізара і, развесіўшы вушы, слухае: ну і малайчына, дае дыхту па поўнай праграме. Ёсць, на жаль, такія.

І неўдамёк яму, абывацелю, што такія цытаты ў ЗША можна знайсці на кожным кроку. Там жа няма, як у нас, дзяржаўных СМІ. Таму і пішуць усё свабодна, як думаюць. І ніхто нікому вусны не закрывае, не канфіскуюць тыражы газет ды іншых выданняў. Лаюць парадкі ў дзяржаве і іх стваральнікаў: сенатараў і кангрэсменаў, губернатараў і прэзідэнтаў. Канешне, у рамках закона аб СМІ. Толькі там гэтыя рамкі не з калючага дроту зроблены. Яшчэ ніводзін грамадзянін ЗША не трапіў за краты "за абразу" каго-небудзь з найяснейшых асоб.

Колькі такіх прарокаў-вешчуноў мы наслухаліся ў былыя савецкія часы на палітінфармацыях, на публічных лекцыях, за рознымі круглымі і квадратнымі сталамі. Ды ці можна ўсё пералічыць!

Здавалася б, ад тых "майстроў палітычнага варыва" нічога не павінна было застацца, акрамя попелу. І ўсё ж хлусня не знікла, як і тыя, хто, дзякуючы ёй, па-ранейшаму абалваньвае мільёны людзей.

Ёсць жа такія, хто ўсёй гэтай балбатні верыць. Гэта ж як трэба не паважаць самога сябе, каб не засвоіць урокі мінулага! Бывала, такія неверагодна салодкія словы аб шчаслівай сытай будучыні ліліся з экранаў тэлевізараў, з дынамікаў радыё, са старонак дзяржаўных СМІ, з вуснаў кіраўнікоў дзяржавы, што можна было слінаю падавіцца. А людзі тым часам душыліся ў чэргах, каб здабыць кавалачак нейкай каўбасы ці сінюшную курыцу. Здараліся смяротныя выпадкі ў гэтых чэргах. Каб неяк задаволіць патрэбу ў прадуктах, звярталіся ў іншыя краіны свету. Не з Палесся разам з жураўлямі прыляцелі ў Беларусь "ножкі Буша" на прылаўкі магазінаў. З ЗША, з зусім іншага кантынента.

Нягледзячы на ўсе намаганні прапагандыстаў ад улады, камунізм праваліўся ва ўсім свеце. Што праўда, сёння хто-кольвечы хоча рэаніміраваць яго пад новай шыльдай — "рынкавы сацыялізм". Нават шмат чаго пераняў ў метадах з былых часоў: амаль прыгонныя ўмовы працы (кантрактная сістэма — сістэма канцлагераў сёння не пройдзе), балбатню, хлусню, зман народа, абяцанкі-цацанкі. Ужо і Сталіна называюць сімвалам Беларусі! Што яшчэ прыдумаюць?

Што ж, будзем чакаць лепшых часоў. Мо і спраўдзяцца словы нашых вешчуноў. Хутчэй бы толькі запусціць спутнік Зямлі (з касмічнай вышыні ўсё бачыцца лепш), каб з яго дапамогай хутчэй пабудаваць у краіне той самы сацыялізм толькі ў іншай вопратцы. І зажывём мы тады на ўсе 100! Мо тады, нарэшце, я разбяруся, калі давядзецца дажыць, што гэта за "рынкавы сацыялізм". А то ўжо добры дзесятак гадоў чытаю праект гэтага дакумента, а ўцяміць ніяк не магу. Нічога ў маёй галаве не застаецца. Мусіць, яна ў мяне на такія мудрагелістыя навукі дзіравая.

Я — не адвакат і не абаронца Злучаных Штатаў. Яны ў гэтым не маюць ніякай патрэбы. Мяне іншае абурае — абраза з боку падобных вешчуноў, якія лічаць мяне за дурня. Здаецца, енчаць яны не ад таго, што свая карова здохла, а ад таго, што ў суседа жывая.

**Анатоль Фёдаравіч**
**КУЛЕШ,**
**жыхар г.Ліда.**

**P.S.**

У суботу, 3 лістапада, зноў паслухаў выступленне таго ж палітаглядальніка і зрабіў канчатковую выснову: галоўная мэта іх (аглядальнікаў) — "па-мастацку хваляваць народ". Знаходзіць і размалёўваць унутраных і знешніх ворагаў.

І зусім не важна, якімі сродкамі гэта робіцца. У маіх вачах ён канчаткова страціў свой імідж палітолага, калі сказаў, што ў Асвенцыме вісеў (і вісіць зараз) лозунг: "Кожнаму сваё". Глупства, пане дабрадзею! Я там бачыў іншы лозунг: "Арбайт махт фрай" — "Праца робіць свабодным" (калі дакладна тлумачыць гэтыя словы).

Дзівіцца гэтаму, канечне, не варта. Яшчэ ніхто і ніколі ў наш час не чырванеў за сваё невуцтва. Сышло ж з рук гісторыку па адукацыі, што ён "паслаў" вучыцца Ф.Скарыну ў Пецярбург, у горад, якога пры жыцці вучонага яшчэ не было. Галоўнае — эмоцыі, пафас, патрыятычны напор!

А каб мне не трапіць у лік зманшчыкаў і пераканацца ў праўдзівасці маіх слоў, раю спадару каментатару-аглядальніку хаця б пераглядзець кніжку-падручнік А.А.Кавалёва і інш. "Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны)" (Изд.ц.БГУ. Минск. 2004, стр.98). Там надрукаваны фотаздымак гэтых самых варот.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## *«Я ехала домой...»*

Вынесены ў загаловак першы радок папулярнага рускага раманса, напэўна, не раз паўтарыла ў думках маладая спявачка Алена Васільева на шляху з Санкт-Пецярбурга ў родны Віцебск, адкуль пасля заканчэння музычнага вучылішча імя І.Салярцінскага 8 год таму скіравалася ў кансерваторыю паўночнай сталіцы Расіі. Атрымаўшы дыплом гэтай знакамітай навучальнай установы, адным з заснавальнікаў і выкладчыкаў якой быў, дарэчы, віцябчанін Іван Салярцінскі, Алена пачала імклівае ўзыходжанне да майстэрства і славы.

Вяртанне А.Васільевай у горад дзяцінства можна лічыць трыумфальным. Летась яна заваявала Гран-пры вельмі аўтарытэтнага ў Расіі конкурсу "Вясна рамансу" і заслужыла тытул "Новая зорка рамансу".

Не дзіва, што канцэрт зямлячкі ў зале Віцебскай абласной філармоніі меў аншлаг.

Варта зазначыць, што вакалістка з Беларусі зрабілася славутасцю ў горадзе на Няве. Яна выступае там у найлепшых залах, яе падтрымлівалі кампазітар Андрэй Пятроў і спявак і рок-кампазітар Юрый Шаўчук, творы якога ўваходзяць у рэпертуар Алены.

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛІСТАПАДА 2007 г.

ОТВЕТ НА ИНТЕРЕСНЫЙ ВОПРОС

# Где живется хорошо?

*Самыми счастливыми европейцами являются жители Копенгагена, Люксембурга и Таллинна. Об этом свидетельствуют результаты опроса, обнародованного европейским социологическим бюро "Евробарометр". Около 90% проживающих в столицах Дании, Люксембурга и Эстонии довольны своей жизнью, в то время как жители Афин, Бухареста и Лондона чаще других выражали недовольство условиями проживания.*

Хорошая работа — несомненно, одна из составляющих счастья, но не везде одинаково легко ее найти. На заработки лучше ехать в Прагу, Копенгаген и Дублин — население этих городов согласно с утверждением, что "хорошую работу найти легко". А население Неаполя и Берлина это категорически отрицает.

Что касается стоимости жилья, то резкий скачок цен в ЕС дал о себе знать. Только 27% респондентов берут на себя смелость утверждать, что можно "найти хорошее жилье по приемлемой цене". Большинство из них живет, разумеется, не в столичных городах, и только жители Берлина в большинстве своем согласны с этим утверждением. Хуже всего обстоят дела с ценами на жилье в Париже, Люксембурге, Дублине, Бухаресте и Братиславе.

Вопрос об экологии стоит гораздо более остро на юге, чем на севере Европы. С утверждением, что "загрязненность воздуха является проблемой", согласны жители 62 городов, в числе которых — все европейские столицы, кроме Люксембурга. В северных странах лучше обстоят дела с парками и зелеными зонами — их количеством довольны 75% респондентов.

Славящиеся своей пунктуальностью немцы довольны работой общественного транспорта — он ходит как часы в Гамбурге, Мюнхене, Лейпциге, Франкфурте-на-Одере и Берлине.

Безопаснее всего жить в Скандинавии — в среднем 97% жителей Финляндии, Швеции, а также Дании чувствуют себя в безопасности в своем городе. Обитатели Стамбула, Неаполя, Софии и Афин придерживаются прямо противоположного мнения.

В целом, европейцам живется хорошо. Первое место по уровню жизни, по данным ООН, занимает Норвегия, причем она удерживает эту позицию уже шестой год подряд.

Средняя продолжительность жизни в этой скандинавской стране составляет 79,6 года, и все взрослое население имеет среднее или высшее образование.

Самая богатая в мире страна также находится в Европе — это Швейцария. По данным Всемирного банка на 2005 год, размер материальных ценностей на душу населения в Швейцарии составил 648 тысяч долларов США. Самые подходящие для жизни города, по данным известного агентства Mercer Human Resource Consulting, тоже находятся в Швейцарии — это Цюрих и Женева.

И среди тридцатки городов из доклада "Международное качество проживания-2007" почти половина находится в Западной Европе. Качество жизни в том или ином городе определялось по таким параметрам, как политическая стабильность, низкая преступность, развитый финансовый сектор, чистый воздух, образование, транспорт, индустрия развлечений.

Материал подготовлен интернет-редакцией www.rian.ru на основе информации РИА Новости и открытых источников.

ФОТОФАКТЫ



*Жители Бангладеш пытаются справиться с последствиями циклона, ударившего по прибрежным районам страны. Его жертвами стали тысячи человек.*



*Сотрудник городских служб в Гамбурге перевозит лебедей в теплое помещение. Подобная процедура здесь осуществляется каждую осень с 1674 года.*

*Александр ЯКОВЛЕВ*

# Сумерки

*(Продолжение. Начало в №№137—188.)*

Мы поехали к другим духоборам, которые живут на границе с США, в Британской Колумбии. Изумительные люди — трудолюбивые, открытые, обходительные. Жили мы в частном доме, ели вегетарианскую пищу, которая просто прекрасна, они это умеют делать, слушали их песни. А все началось с того, что однажды в посольство зашел Иван Иванович Веригин — вождь духоборов. Духоборы (борцы за духовность) — поразительное явление. Где-то далеко от России, на другой половине земного шара, на западе Канады, на приграничных с Соединенными Штатами землях, живет община русских людей, бережно хранящих язык и традиции своей Родины, которую они с болью покинули еще в конце позапрошлого века.

На зло отвечать смирением, плохого человека убеждать добросердечием. Жить по законам веры и совести... Они вполне искренне верят, что только нравственные устои спасут человечество от морального распада. Гонимые ветром судьбы, преследуемые властью и ударами трагических потерь, эти упрямые люди, пусть порой наивные в своих заблуждениях, пронесли через все испытания непримиримость к обману, фарисейству и насилию, непреклонное неприятие милитаризма. Духоборы иносказательно назвали себя *"Плакун-травой, плывущей напротив воды"*. Они продолжают проповедовать покорность, разумение, воздержание, братолюбие, сострадание, добрый совет в своих неукоснительных правилах жизни, принципы, которые помогают им преодолевать зло и самосовершенствоваться. Есть свои двенадцать заповедей: правда, чистота, труд, послушание, рассуждение, воздержание и другие. Семь грехов смертных: гордость, сребролюбие, блуд, гнев, чародейство, зависть, уныние. За многие годы скитаний и лишений духоборы выработали свои правила поведения. Они достойны внимания. На мой взгляд, эти принципы вполне могут претендовать на кодекс общечеловеческих моральных ценностей. Перечислю некоторые из них.

*Уважение достоинства человека в себе и в других; все существующее рассматривается с любовью и восторгом; все в мире — последовательное движение к совершенству; наивысшей формой этого движения является человек, поэтому надо избегать того, что вредит и затемняет человека, например употребление табака, алкоголя, мяса животных и т.п.; не допускать в свое сердце чувства ненависти, мщения, зависти, содержать свои мысли в чистоте; нанесение ущерба или разрушение живого заслуживает порицания; отношение к животному миру, природе должно быть любовным, не опустошительным, а созидательным; все организации, в основу которых положено насилие, противозаконны; главной основой человеческого бытия является энергия мысли — разум; общинная жизнь, основанная на силе нравственности; древо познается по плодам, человек — по разуму, а друг — по приветствию; человек никогда не должен терять спокойствия духа и чувства собственного достоинства, должен быть сдержанным и в радости, и в горе.*

Старинная и современная русская песня служит той духовной ниточкой, которая каждодневно напоминает людям на чужбине об их нелегком и долгом пути на другой край планеты, о земле их предков, о том вечном, что называется родной землей, Родиной. Такова судьба горстки русских людей, угнанных жизнью за тридевять земель. Эту судьбу не назовешь ни горькой, ни сладкой, ни героической, ни трагической. Они выбрали ее осознанно, по убеждению. Их мотала по земле злая воля других, тех, с кем они вступили в несогласие, то есть с иерархами церкви и правительством. Невероятно стойкие к ударам судьбы, непреклонные в своей вере, они пронесли через столетия свою надежду на справедливость.

Живет в моей памяти и приезд Горбачева в Канаду. И во время встреч в Москве в связи с подготовкой к этому визиту, и во время поездки он показал себя с самой лучшей стороны. Открыт, прост, любознателен, мастер дискуссии, убедителен в аргументах, откровенен без каких-либо оговорок. Уже тогда я искренне хотел, чтобы он стал лидером государства, говорил об этом открыто.

Однажды Трюдо спросил меня:

— Почему вы настаиваете, чтобы Горбачева принимали на самом высоком уровне? Он ведь приглашен министром сельского хозяйства Юджином Веланом?

Я ответил:

— Горбачев — будущий лидер страны.

— Вы уверены?

— Уверен.

Трюдо долго смотрел на меня. Будучи умным и осторожным политиком, он не спешил поверить в это. Но мое мнение, видимо, подтолкнуло его к размышлениям. Так или иначе, после этого разговора многое изменилось. Качество организации встреч Горбачева было явно повышено. Вместо одной запланированной встречи с Трюдо состоялось три. Причем две — сугубо неформальные, с продолжительными разговорами, далеко выходящими за рамки официальных встреч. Оба политика были явно довольны друг другом.

Когда Трюдо перестал быть премьер-министром Канады, Горбачев организовал ему поездку по Сибири вместе с его детьми — Устином, Михаилом и Александром.

Але некаторым старым з завулка Фогеля гэта не вельмі зразумела, бо яны прывыклі ўсё жыццё хадзіць пад бізуном, рабіць тое, што скажуць, і думаць так, як скажуць. І ніякага дзіва няма, што многае з таго, пра што гавораць маладыя, да іх, так бы мовіць, не даходзіць.

— О, цяпер жыць добра! — кажа адна васьмідзесяцігадовая бабуля, якая атрымлівае крышку больш за 200 тысяч рублёў пенсіі і есць, як сама казала, малако, тварог ды батон. — Некалі я са сваёй вёскі ў Дзятлава за дзевяць кіламетраў босая хадзіла, бо абуць не было чаго, а цяпер маю і боты, і туфлі, і тапкі...

— І гумовыя шлёпанцы, — хітра прыжмурыўшы вочкі, падказвае малая праўнучка.

Разумныя людзі ва ўсёй краіне шукаюць выйсце з тупіка. І знойдуць, бо час цяпер такі, што нельга жыць па-ранейшаму. Мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы, а не на якім-небудзь закінутым востраве.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**
**Дзятлаўскі раён.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЛІСТАПАДА 2007 г.

## СЛЫШАЛИ?

### Войтюшкевич выпустит шведский альбом

Музыкант вернулся из Стокгольма, где получил благословение поэтессы Катарины Фростенсан на запись и издание песен на ее стихи.

— Катарине очень понравилась и музыка, и перевод ее текстов на белорусский язык, — рассказал Дмитрий. — Я так счастлив! Ведь Катарина Фростенсан человек не только известный во всей Швеции, но еще и придирчивый. А мое творчество одобрила. С нетерпением жду момента, когда смогу приступить к записи.

### Плотникова спелась с Пшеничным

Теперь Ольга Плотникова в дуэте с Виктором Пшеничным исполняют композицию с романтическим названием “Алые паруса”.

По словам Ольги, дуэт образовался спонтанно. Изначально музыку к песне на слова Леонида Войтовича “Алые паруса” композитор и супруг Ольги Плотниковой Геннадий Маркевич написал совершенно для другого исполнителя. Композиция настолько понравилась певцу и аранжировщику Виктору Пшеничному, что он предложил исполнить песню вместе с Ольгой Плотниковой.

Сама Ольга Плотникова называет песню “литературной” и говорит, что во время ее исполнения чувствует себя героиней одноименной повести.

### Саманта Фокс и Петр Елфимов споют в одном концерте

Первый национальный телеканал пригласил на новый год исполнительницу знаменитой “Ламбады” Каому, звезду 1980-х Саманту Фокс и звездное трио Mr President.

Из отечественных звезд в новогоднем шоу появятся **“Белорусские песняры”, “Da Vinci”, “Топлесс”, “Тяни-Толкай”, Инна Афанасьева, Дмитрий Колдун, Петр Елфимов, Александр Тиханович и Ядвига Поплавская, Александр Солодуха, Ольга Барабанщикова, Венера, Ирина Дорофеева, Алеся, Алексей Хлестов, Искуи Абалян, Александра Гайдук, Ирина Игнатюк, Галина Шишкова, Саша Немо.**

Из заезжих звезд в шоу также снялись Лада Дэнс, группы “Челси” и “Tokio”.

### Тамара Лисицкая и Глеб Морозов создают NETрадио

“Это будет многоканальная профессиональная интернет-радиостанция! — говорит Тамара Лисицкая. — Более тридцати музыкальных каналов! Лучшие люди в качестве ведущих — **Глеб Морозов, Борис Штерн, Алесь Мухин, Евгения Павлина, Наталья Батракова** и другие...

Стартуем сразу двумя потоками — NETradio Adult и NETradio Hot. Одна станция будет крутить шикарную музыку “для взрослых” — рок-поп-классику, блюз, джаз, лаундж, хард-рок... Вторая кнопка — “Hot” — это 100 самых популярных сегодня хитов + модные музыкальные течения — RnB, рэп, хип-хоп, современная электронная музыка, поп-рок, всякое клубное дело. На каждой из станций — вагончик программ и голосов, отличных, клас-с-с-сных, профессиональных. Подробности — на блоге радио www.netradio.by".

Ожидается, что полноценную работу NETradio начнет в новогодние праздники.

## КРУПНЫЙ ПЛАН

*Филипп ЧМЫРЬ:*

# «Пока меня не лапают за зад, я отношусь ко всем хорошо...»

*Филипп Чмырь — это его настоящее имя. Он лидер известной группы “Drum Ecstasy”, которую одинаково часто можно услышать как на неформальных фестивалях, так и на свадьбах. Однако о несценической жизни барабанного гитариста известно немного. “Народная воля” решила исправить ситуацию...*



**— Всю осень 1997 года музыканты “Drum Ecstasy” играли концерты в школьных платьях под лозунгом “В джангле только девушки”. Это была акция в поддержку трансвеститов. Как лично вы относитесь к людям нетрадиционной ориентации?**

— Пока меня не лапают за зад, я отношусь ко всем хорошо. Всегда шучу, что не люблю парней, которые увлекаются парнями, по одной причине — в стране больше женщин, чем мужчин, и потому такой выбор для меня немного странен. А девушки, по понятным причинам, выбирают девушек. Общаясь даже с продвинутыми, европейски ориентированными, всеми такими интеллигентными и свободомыслящими парнями, могу заявить, что все они — конченые подонки и сексисты. Сексизм — проблема нашей страны. И из этого многое вытекает: низкая культура отношения мужчины к женщине, его агрессивное поведение, его неуважение к себе и к ней. У нас изначально мало свободных девушек. Вот почему я так балдею от Европы — там идешь по улице и видишь совершенно других женщин: независимых, свободных... Ведь куда приятней влюбиться в свободного, независимого человека, чем в какую-то рыбу-прилипалу, которая будет потихонечку сосать из тебя соки и пытаться переделать. Поэтому многие мужчины и боятся женщин — их вначале заманивают, а потом заставляют одеть тапочки. Союз между мужчиной и женщиной должен быть равноправным. В Европе два равноценных человека просто решают, что им хорошо и удобно быть вместе... У этой женщины есть велосипед, собачка и два часа на тебя. И это прекрасно!

**— “Drum Ecstasy” участвовали в таких проектах, как “Стоп СПИД”, “Защити себя”, “Скажем детям да”... Лично вы считаете себя социально активным человеком?**

— Моя социальная активность проявляется в том, что почти каждый день я пишу замечания в жалобную книгу. Люди вкладывают большие деньги в свой бизнес, а после этого тот, кому дали там работать, просто не выполняет свои обязанности. В таких случаях я, конечно, сражаюсь и за того, кто вкладывает деньги в это, и за себя, как за того, кто платит деньги. Я борюсь с нашим “излюбленным” славянским сервисом везде: начиная с ресторанов и заканчивая банками. Если в меню написано, что это эспрессо, то это должно быть эспрессо, а не грязная вода. Меня уже везде узнают. Бывало такое, что я приходил в ресторан и мне приносили вместе с меню сразу жалобную книгу... Но я ведь прихожу в следующий раз в это же кафе и вижу что кофе стал гораздо лучше! Может, они плюнули туда для пенки, но пенка-то прекрасная!

**— Считаете ли вы, что искусство должно быть аполитично? Или в нашей стране это невозможно?**

— Искусство должно заниматься вечными темами — отношениями людей, глубинными страхами человека. Оно должно больше работать с личностью, чем с обществом. Но в ситуации, когда существует нездоровое общество (а я считаю, что наше общество сейчас болеет), тебя просто заставляют заниматься этим... Не могу сказать, что я с оппозицией. Я не вижу разницы между теми, кто сейчас у власти, и теми, кто может к ней прийти. Они одинаково опасны для творческой, свободной личности. Все помнят фразу молодежного подразделения БНФ о том, что их беспокоит нецентрализованное существование молодежных организаций в Беларуси, и что они хотят их всех объединить под своим крылом. Чем они отличаются от БРСМ?

**— Но в то же время вы говорите “Подождем...”. А чего тогда ждать, если, по-вашему, одни не лучше других?**

— Я надеюсь на третью силу, которая появится со сменой власти, надеюсь, что у следующих хотя бы оппозиция нормальная будет. Проблема не в том, что в Беларуси 94% голосуют за президента Лукашенко. Да пусть даже 99%! Но оставшийся один процент имеет те же самые права, что и 99%, проголосовавших “за”. Меня не интересует, на чьей стороне будет сила, в какую сторону мы будем гнать газ. Мне важна свобода людей, которые не хотят идти в строю.

**— Ваша группа выступает на высокооплачиваемых мероприятиях. Ниже какой суммы не будете выступать?**

— Ниже нуля никогда не согласимся играть. Если нас приглашают на какие-то социальные проекты, то мы без вопросов выступаем бесплатно. Даже в минус иногда уходим. Есть мероприятия, затраты на которые мы берем на себя. Были даже такие случаи, когда мы отменяли ради этого коммерческие концерты. Но если берем, то берем дорого. Мы вообще дорогая группа.

**— А где и для кого ни за что не выступите, не согласитесь играть ни за какую сумму?**

— Для Дмитрия Павличенко, которого подозревают в устранении Гончара, Захаренко, Красовского и Завадского, явно ни за какие деньги не согласимся выступать. Мы не хотим работать с БРСМ. Потому что не считаем их демократической структурой. Мы не хотим работать на государственных мероприятиях. Нет, мы не оппозиционеры, и не хотим таковыми быть, нас больше заботит социальная проблематика, свобода слова, свобода личности и права человека. Мы точно так же можем отказать БНФ, если они ерунду предлагать будут.

**— Группу в силу торжественности барабанного звучания часто приглашают на свадьбы. Как играется на таких мероприятиях и что за люди приглашают вас на свадьбы?**

— Самые разные люди. Играем с удовольствием. Мы музыканты и должны как-то зарабатывать деньги. К тому же такие красивые невесты, что просто глаз не оторвать! Мы встречали невесту из загса, как-то в девять утра помогали жениху “вышибать” невесту из дома. Даже на среднестатистические свадьбы все чаще и чаще приглашают барабаны.

**— А какая музыка играла у вас на свадьбе?**

— У нас звон бутылок стоял, а не музыка *(смеется)*. Мы просто “зажали” свадьбу. Мы решили расписаться незаметно для всех. Нам негде было отмечать, мы делали ремонт, у нас и времени не было. Мы тихонечко расписались, потом нас рассекретили, и случилась спонтанная пьянка.

**— Расскажите про свою жену.**

— Она у меня умница, красавица, очень, как это модно говорить сейчас, продвинутая женщина во всех отношениях. Она работает в шведском посольстве, занимается там вопросами культуры. Увлекается фотографией... В целом у нас одинаковые взгляды на жизнь, но можем и сильно не сойтись в чем-то. Вплоть до того, что можем спиной друг к другу лечь спать. Я, например, за легализацию всех видов наркотиков, она — против. Я — за большую либеральность в обществе, с одной стороны, а с другой — за местное закручивание гаек. Например, я против рекламы, рассчитанной на детей. Потому что дети не являются людьми, принимающими какие-то финансовые решения, и родители могут иметь совершенно негативное отношение к этому продукту.

**— Думаете ли вы с женой о детях не только в контексте рекламы?**

— Думаем. У нас все проектно, и дети в расписание внесены... Я бы хотел одного своего ребенка, а если больше, то взял бы адаптированного, усыновленного ребенка. Потому что детей много, а родителей хороших мало.

**— Кем вы мечтали стать в детстве?**

— Рок-звездой. Или президентом. Еще в Советском Союзе я хотел быть президентом Республики Беларусь. Все надо мной издевались и говорили — ты с ума сошел, президентом Беларуси быть нельзя, потому что у нас Советский Союз. Но все меняется, и мечты становятся реальностью! Сейчас я подумал, что президентом быть не хочу. А вот стать депутатом входит в мои планы. Я чувствую, что как от депутата от меня в будущем будет толк. Поэтому когда страна станет демократичной и адекватной, я попробую себя на этом поприще.

**— В одном из интервью на вопрос о том, легко ли жить с фамилией Чмырь, вы ответили, что жить великолепно, главное — дожить до 18 лет. А что было до 18?**

— До этого была незащищенность от постоянных насмешек. Реакция окружающих была и есть постоянно, но сейчас я знаю, как этим пользоваться. На самом деле иметь такую фамилию — это очень-очень классно! Тебя никто никогда не забывает. Я мог бы взять мамину фамилию, но фамилия Кравцова — что это такое? Как с этой фамилией жить? В тоске только. Я мог взять красивую фамилию бабушки — Данилевская. Но тоже как-то постно. Фамилия должна быть острой. Вот мне нравится мужская фамилия Бабоед. Фантастика! Иногда я завидую таким фамилиям, думаю — вот это фамилия, вот ее бы я взял...

**— Взяла ли жена вашу фамилию?**

— Нет, даже моя мама не взяла фамилию моего папы. А зачем женщине брать фамилию мужа? В этом уже есть что-то не то, подчинение женщины мужчине. Это рудимент, который должен отвалиться у нашего общества. Женщина периодически уходит от мужчин, и что, она должна коллекционировать их фамилии? Я считаю, что она должна носить фамилию семьи, из которой она пришла.

**Ольга ПРУДНИКОВА.**

## БЛІЦ

### Як вы ставіцеся да прапановы забараніць выкарыстанне фанаграмы?

**Нагадаем, што ў мінулым нумары “Народнай волі” саліст вядомага гурта “Atlantika” Аляксей Набееў выступіў з ініцыятывай забараніць канцэрты пад фанаграму.**

**“Чаму людзі павінны плаціць грошы за тое, што іх падманваюць?!” — кажа Алекс.**

**“Народная воля” высветліла пацікавіцца, ці падтрымліваюць артыста іншыя прадстаўнікі беларускага шоу-бізнесу і што думаюць на гэты конт палітыкі, якія таксама спяваюць...**



***Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка, “твар Беларусі”:***

— Я ўжо шмат гадоў працую без фанаграм, і таму хачу, каб так рабілі і астатнія. Гледачы павінны назіраць сапраўдную працу артыстаў. Калі артыст сочыць за дыханнем, у яго правільна пастаўлены голас — неабходнасць у фанаграме проста адпадае. Сапраўдны прафесіянал выканае пастаўленую перад ім задачу ў любым стане.

***Алег ЦІВУНОЎ, былы мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады:***

— Шэраг сітуацый патрабуе выкарыстання “плюсавых” фанаграм: кіназдымкі, вялікая прастора для выступлення пры малой колькасці апаратуры і г.д. У мяне патрэбы ў выкарыстанні фанаграм не ўзнікае, таму што колькасць маіх канцэртаў нельга назваць вялікай, і праходзяць яны ў камернай абстаноўцы, з выкарыстаннем добрай апаратуры. І ўвогуле, адкуль гэтым праблемам узяцца, калі ў мяне, дзякуй Богу, ёсць голас і я ўмею спяваць?

***Вера КАРЭТНІКАВА, спявачка і прыгажуня:***

— Я стаўлюся да такой прапановы цалкам станоўча. Неабходна выкарыстоўваць карысны вопыт замежжа, дзе такія меры былі прыняты ўжо вельмі даўно і ў людзей з’явілася імкненне працаваць па-сапраўднаму: спяваць, танцаваць, ствараць феерычнае шоу ўжывую, а не выходзіць на сцэну, каб проста адчыняць рот. Канечне, многія сцвярджаюць, што выкарыстоўваюць “даблы”: гучыць “плюсавая” фанаграма, але мікрафон спевака ўключаны. І ўсё ж “мінус” (калі “пад фанеру” гучыць толькі музыка, а артыст спявае сам) — зусім іншая справа, гэта не падман гледачоў. А ўвогуле, забарона на выкарыстанне фанаграм дасць артыстам штуршок да ўласнага развіцця, пазбавіць магчымасці таптацца на адным месцы. У нас не настолькі развіты шоу-бізнес, каб можна было дазволіць сабе ленавацца ў гэтым плане, мы не забяспечаны вялікай колькасцю канцэртаў, якія б цалкам выявілі вакальныя даныя. Таму я поўнасцю падтрымліваю Аляксея. Такая пастанова шмат для каго стала б проста шчасцем. А як цудоўна было б, калі б у рамках тэлевізійных праектаў кшталту “Песня года” гучала жывое выкананне! Няхай гэта будзе не прамая трансляцыя, а запіс — усё роўна адразу ж узрасце рэйтынг такіх мерапрыемстваў, папулярнасць артыстаў, якія будуць браць у іх удзел. Прапанова Аляксея Набеева заслугоўвае адзнакі “10" з дзесяццю вялізнымі плюсамі.

Калі выкарыстанне фанаграмы неабходна? Ну, на некаторых розных тэлевізійных праектах цябе проста прымусяць да яе звярнуцца, каб ты не выбіваўся з кампаніі артыстаў, што спяваюць “фанерна”, і не ўскладняў сам працэс здымак. Ёсць яшчэ адно выключэнне — гэта зімовыя канцэрты, якія праходзяць на адкрытых пляцоўках. З-за моцных маразоў і халодных грымёрак галасавыя звязкі могуць прыйсці ў аніякі стан, таму артыст проста вымушаны выкарыстоўваць фанаграму, каб канчаткова не нашкодзіць сваёй далейшай кар’еры. Я лічу, што выкарыстанне фанаграмы з’яўляецца прававерным пры выступленні на “карпарацівах”, дзе наўрад ці хто-небудзь будзе спрабаваць ацаніць тваё вакальнае майстэрства, а табе неабходна паберагчы сілы для будучых сур’ёзных выступленняў і рэпетыцый.

Асабіста сябе я не лічу цалкам адаптаванай да жывых канцэртных выступленняў і таму звяртаюся да фанаграмы, калі са мной у нумары ўдзельнічае балетны калектыў і мне даводзіцца шмат увагі звяртаць менавіта на танцавальную частку. Але я імкнуся звесці выкарыстанне “плюсаў” да мінімуму, каб заслужыць павагу слухачоў, і ўвогуле я проста люблю спяваць ужывую.

***Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА, артыстка, спартсменка і тэлевядучая:***

— Лічу, што, калі будзе прынята такое рашэнне, вялікая колькасць выканаўцаў проста знікне. Ведаеце, шмат хто з іх ужывую спявае вельмі дрэнна. Таму трэба даць артыстам магчымасць выступаць так, як ім падабаецца. Мы ўсе выкарыстоўваем фанаграмы на вялікіх канцэртах, і ў мяне на гэта ніякіх нараканняў не ўзнікае.

***Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ, спяваючы член Палітсавета Аб’яднанай грамадзянскай партыіі:***

— Цікава, цікава! Мне здавалася, што “Atlantika” менавіта спевамі пад фанаграму і займаецца, а яны, аказваецца, малайцы! Я лічу, што было б правільна ажыццявіць такую забарону, бо выкарыстанне фанаграм без неабходнасці — сапраўдны падман і прафанацыя, бо ў такім выпадку нельга казаць, што артыст па-сапраўднаму выступае, дзеліцца з залам сваёй энергіяй. А ў выпадку нязгоды з даным палажэннем на афішах неабходна рабіць надпісы: “жывы гук” альбо “фанаграма”. Тады гледачы змогуць зрабіць для сябе правільныя высновы і вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці наведвання канцэрта.

Асабіста я і мой гурт былі аматарамі, а не прафесіяналамі, а аматары музычнай дзейнасцю і займаюцца менавіта дзеля таго, каб рабіць тое, што ім прыемна. Для нас было прыемным выкананне ўжывую, а не “пад фанеру”.

***Ларыса ГРЫБАЛЁВА, артыстка, уладальніца “Святочнага агенцтва”:***

— Гэта зусім не новая ініцыятыва, і ў Расіі гэтае пытанне нельга лічыць вырашаным, хоць яно было ўзнята вельмі даўно. Прымаць нейкае катэгарычнае рашэнне не мае сэнсу — усяму будзе свой час.

Лічу, што свой сольны канцэрт патрэбна рабіць “жывым”, а калі гэта “зборная салянка”, то ў адмове ад выканання пад фанаграму проста няма сэнсу. Дый зараз прафесіянальныя спевакі амаль заўсёды выкарыстоўваюць “даблы”, якія дапамагаюць застрахавацца ад непрадбачаных выпадкаў.

***Аляксандр КУЛЛІНКОВІЧ, лідэр гурта “Нейра Дзюбель”:***

— Я да гэтай ініцыятывы ніяк не адношуся. Лічу, што эстрадныя музыканты (мне не падабаецца слова “папса”) маюць права выкарыстоўваць фанаграмы для сваіх выступленняў, а некаторыя рэчы проста не змогуць без гэтага добра прагучаць.

Колькі разоў “Нейра Дзюбель” выступаў не ўжывую? Толькі два разы. На “Камедзі-клаб” мы выконвалі песню “Бухаст” — гумарэску ў бок гурта Rammstein, канешне, мы хацелі б яе проста праспяваць, але ў нас проста не атрымалася.

Ці лёгка пазбегнуць цяжкасцяў, якія падчас здараюцца пры выкарыстанні фанеры? Ведаеце, я зразумеў, што нават такое выкананне — вялікая і напружаная праца...

***Альберт СКАРАХОД, спявак, спартсмен і кампазітар:***

— Я супраць фанаграм і ніколі імі не карыстаюся. Навошта такім артыстам увогуле выходзіць на сцэну?.. У такім выпадку нельга казаць аб прафесіяналізме.

***Аляксей ХЛЯСТОЎ, адзін з самых стыльных і незакамплексаваных беларускіх артыстаў:***

— Я толькі за! І калі той жа Кіркораў, каментуючы забарону Лужкова на выкарыстанне фанаграмы, кажа, што дзяржаўныя структуры не маюць сродкаў для стварэння артыстам годных умоў і тэхнічнага забеспячэння для якасных жывых канцэртаў, то гэта праблема толькі даных структур і датычыцца. Вядома, калі патрабаванні, указаныя ў райдэры, выконваюцца цалкам, працаваць артысту намнога лягчэй. Безумоўна, выкарыстанне “плюсавых” фанаграм — падман. Але гэта можа быць мэтазгодным толькі ў дачыненні да інструменталу, бо калі выступленні будуць афармляць выключна ўжывую, “кошт” беларускіх артыстаў узрасце ў чатыры разы.

**Ірына МУРАЎЁВА.**

## СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

# Пра што марыць Ірына Ітэйра?

*Днямі адбылася прэзентацыя дэбютнага кліпа беларускай бізнесвумен спявачкі Ірыны Ітэйра “Мара”.*

Размах вечарынкі з нагоды выхаду кліпа ўражваў. Усім прысутным шчодрая гаспадыня раздорвала парфюмерныя наборы, гасцей частавалі прысмакамі. Адпаведным быў і склад запрошаных гасцей. Як прызналася сама Ірына, прэзентацыю наведалі прадстаўнікі бізнес-эліты краіны — бізнесмены ў дарагіх касцюмах з кветкамі ў руках у суправаджэнні прыгажунь цярпліва чакалі пачатку прэзентацыі.

У дзень прэзентацыі кліпа Ірына шакіравала ўсіх зменай сцэнічнага псеўданіма. Калі раней яна выходзіла на сцэну як Ірына Ітэра (гэта кампеляцыя сапраўднага імя і прозвішча спявачкі — па пашпарце яна Ірына Цярэшчанка), то зараз спявачка стала Ірынай Ітэйра.

*“Як вы ведаеце, ёсць буйная кампанія ”Ітэра", —* тлумачыць яна. *— Для таго каб пазбегнуць непаразуменняў, я і вырашыла ўставіць у сцэнічны псеўданім яшчэ адну літару".*

Кліп на песню “Мара” даволі гламурны. Некаторыя кадры ў ім атрымаліся занадта шчырымі — там, акрамя пялёсткаў руж, на Ірыне нічога няма.

*“Цяжка прыходзілася аператарам, якія здымалі гэтыя кадры. Які ж мужчына вытрымае?”* — жартаваў прадзюсер Ірыны Уладзімір Хадасевіч. Таксама ў жарт Уладзімір ператтварыў адказ на пытанне карэспандэнта “Народнай волі” аб бюджэце кліпа.

*“А вы бачылі ў кліпе за спінай у Ірыны з’яўляецца лічба ў мільён долараў?* — перапытаў Хадасевіч. — *Лічыце, што гэта адказ на ваша пытанне”.*

*Песня “Мара” атрымалася “прыстойна-папсовай”.* Падобных песень на эстрадзе, шчыра кажучы, хапае. Аўтар твору — усё той жа Уладзімір Хадасевіч — на папрокі аб залішняй “лёгкасці” песеннага тэксту адрэагаваў наступным чынам: *“Гэта, канечне, не паэзія. Песня напісана ў стылі ”кедыпаўкеды". Аднак я вас запэўніваю, што гэтай песняй не прэтэндую на нейкія паэтычныя лаўры, хаця ўпэўнены, што прадукт атрымаўся якасным".*

Хутчэй за ўсё ў бліжэйшым будучым варта чакаць сольнага канцэрта Ірыны Ітэйра.

*“Усё распачыналася як хобі, —* гаворыць Уладзімір Хадасевіч. *— Але я бачу, што Ірына хоча займацца кар’ерай спявачкі прафесійна. Яна вельмі многа працуе, займаецца вакалам, бярэ ўрокі харэаграфіі”.*

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**



### Дарэчы

*Адзін з сяброў Ірыны Ітэйра — маскоўскі бізнесмен прыехаў на прэзентацыю кліпа сяброўкі не з пустымі рукамі. Ён падарыў Ірыне сотавы тэлефон з белага золата. Апарат упрыгожаны брыльянтам. Яго кошт — больш за дзесяць тысяч долараў.*

## ПРЭМ’ЕРЫ

### Лісты паміраючага хлопчыка, альбо Калыханка Ружовай мамы

**На сцэне Сучаснага мастацкага тэатра чарговая прэм’ера — спектакль па п’есе французскага драматурга Эрыка Эмануіла Шміта “Аскар і Ружовая дама”.**

Спектакль паставіла малады рэжысёр, выпускніца Акадэміі мастацтваў Кацярына Аверкава. Як высветлілася, Кацярына марыла аб гэтай пастаноўцы яшчэ са студэнцкіх часоў...

Галоўны герой твора — хворы на анкалогію дзесяцігадовы хлопчык Аскар, якому засталося жыць 12 дзён. Ён знаходзіцца ў бальніцы, дзе створаны спецыяльны інстытут “Ружовых дам”, якія прыходзяць да цяжкахворых дзяцей і спрабуюць аказваць ім падтрымку. І Ружовая дама альбо Ружовая мама, як называе яе Аскар, прапануе яму гульню, правілы якой даволі простыя: лічыць, што кожны дзень яго жыцця роўны 10 гадам жыцця звычайнага здаровага чалавека. І кожны дзень дасылаць ліст Богу, а Бог у сваю чаргу будзе выконваць адно душэўнае жаданне хлопчыка. “Душэўнае” — значыць, што выпрошваць сабе выздараўленне, цэнтнер піражных і ўсё астатняе, з чым звычайна звяртаюцца да Дзеда Мароза, не мае сэнсу. Бог — не Дзед Мароз, ён робіць толькі тое, што патрэбна для душы, — сцвярджае Ружовая дама.

П’еса Шміта надзвычай актуальная ў наш час. Нягледзячы на, здавалася б, змрочную атмасферу, у якой разгортваецца дзеянне, п’еса прасякнута светлым і шчырым гумарам, усведамленнем таго, што жыццё будуецца не толькі на працы і матэрыяльных каштоўнасцях.

У будучым Сучасны мастацкі тэатр плануе яшчэ неаднаразова звярнуцца да п’ес геніяльнага драматурга. А пакуль на прэм’еру спектакля запрашае сацыяльнага педагога-псіхолага дзіцячага анкалагічнага цэнтра, каб вызначыцца з магчымасцю дабрачыннага паказу спецыяльна для хворых дзяцей.

Ролі ў спектаклі выканалі выпускнік Акадэміі мастацтваў Сяргей Беляковіч і народная артыстка Беларусі Бэла Масумян.

У афармленні былі выкарыстаны малюнкі дзяцей, што праходзілі лячэнне ў Рэспубліканскім навукова-практычным Цэнтры дзіцячай анкалогіі і гематалогіі.

Наступныя прэм’ерныя паказы “Аскара і Ружовай дамы” адбудуцца 7 і 20 снежня.

**Ірына МУРАЎЁВА.**

НОВАЕ ІМЯ

*Дзяніс ФЁДАРАЎ:*

# «Галоўным стымулам чалавечага жыцця была і застанецца надзея...»

*Днямі Тэатр-студыя імя Яўгена Міровіча Беларускай акадэміі мастацтваў прэзентаваў спектакль па матывах культавага рамана Кена Кізі "Палёт над зязюлiным гняздом". Гэта выключна смелы крок, асабліва з-за існавання аскараноснага аднайменнага фільма з Джэкам Нікалсанам у галоўнай ролі, і пастаноўкі балгарына Аляксандра Морфава "Затменне", дзе вобраз галоўнага героя стварыў непаўторны Аляксандр Абдулаў. Тым не менш студэнты Акадэміі мастацтваў здолелі сказаць новае слова ў трактоўцы геніяльнага твора, а гледачоў на прэм'еру прыйшло столькі, што шмат каму давялося глядзець спектакль стоячы. Ролю рэжысёра ўзяў на сябе Дзяніс Фёдараў, студэнт чацвёртага курса спецыялізацыі "Рэжысура драмы".*

**— Дзяніс, раскажы, калі ласка, з чаго пачалося тваё захапленне тэатрам?**

— Я скончыў музычную школу, затым музычнае вучылішча, таму можна казаць, што стасункі з мастацтвам я маю ўжо вельмі даўнія. Пасля некаторы час вывучаў юрыспрудэнцыю. Навучаўся і ў Інстытуце культуры, але мне там не спадабалася, і я вырашыў перайсці ў Акадэмію. Мне заўсёды хацелася звязаць сваё жыццё з творчасцю, як выявілася, я проста не магу займацца чымсьці іншым, нягледзячы на шматлікія спробы.

**— Напэўна, на першым месцы для цябе заўсёды быў не матэрыяльны прыбытак, а любімая справа.**

— Не сказаў бы. Але я проста не здолеў самога сябе ў чымсьці перамагчы, пераламаць. Мне падабаецца тэатральнае мастацтва.

**— Чаму ты выбраў менавіта Кен Кізі і яго знакавы твор, у які вельмі цяжка прыўнесці сваё арыгінальнае бачанне?**

— Мяне вельмі захапляюць і раман, і фільм. У першую чаргу трэба было зрабіць нешта адрознае ад фільма, бо я ведаў, што менавіта з ім спектакль будуць супастаўляць у першую чаргу, а галоўнага героя будуць спрабаваць параўнаць з Джэкам Нікалсанам.

Наколькі я ведаю, змест кнігі не быў перададзены ў фільме ў поўным аб'ёме. Канечне, Кен Кізі — гэта ў першую чаргу пакаленне хіпі, гэта іншая краіна, іншы час. А мне хацелася аформіць усё так, як быццам дзеянне адбываецца ў наш час і на прасторах нашай краіны. Героі таксама павінны былі стаць больш сучаснымі. А ў гледачоў хацелася выклікаць у першую чаргу станоўчыя эмоцыі. Гэты спектакль павінен сцвярджаць думку аб тым, што з любой сітуацыі магчыма знайсці выйсце, а галоўным стымулам чалавечага жыцця была і застанецца надзея.

**— Скажы, а гэта ўвогуле твая першая рэжысёрская праца?**

— Гэта першая праца на вялікай сцэне.

**— Усе занятыя ў пастаноўцы акцёры з'яўляюцца студэнтамі Акадэміі мастацтваў?**

— Так.

**— У спектаклі толькі адна жаночая роля. Таму хочацца спытаць, ці не ўзнікла ў цябе цяжкасцей пры пошуку таленавітых акцёраў-мужчын? Як вядома, хлопцаў у нас не хапае амаль ва ўсіх сферах мастацкай дзейнасці.**

— Не, з кадрамі мужчынскага полу ў тэатры праблем няма. А многія з іх не толькі таленавітыя акцёры, але і неблагія рэжысёры.

**— А асабіста ты адчуваеш пэўную роднасць з галоўным героем?**

— Безумоўна. На прыкладзе Макмёрфі можна навучыцца перамагаць. А яму, як і мне, давялося змагацца з самім сабою, прычым змагацца вельмі пахова. Дарэчы, галоўную ролю ў спектаклі выканаў студэнт пятага курса Віктар Красоўскі.

**— Мяркую, такі спектакль грэх не прадставіць на якім-небудзь фестывалі.**

— Так, мы павязём яго на фестываль "Март-контакт" у Магілёў. Цікава, што ў гэтым фэсце будуць браць удзел ужо дарослыя калектывы з краін блізкага і далёкага замежжа.

**— Жадаючы табе творчых поспехаў, хацелася б даведацца, ці хутка малады рэжысёр Дзяніс Фёдараў парадуе гледачоў новымі пастаноўкамі?**

— Магу сказаць, што хутка. Новых ідэй у мяне проста безліч, але агучваць іх пакуль не буду, каб не сурочыць.

**Ірына МУРАЎЁВА.**

ЗАПРАШЭННЕ

*6 снежня ў Тэатры-студыі імя Яўгена Міровіча Беларускай акадэміі мастацтваў можна зноў пабачыць "Палёт над зязюлiным гняздом".*

ЗДАРЭННЕ

## *Выкладчыкі засталіся без заробкаў*

Віцебская міліцыя яшчэ не здолела знайсці злодзеяў, якія скралі стыпендыю ў першакурснікаў Акадэміі ветэрынарнай медыцыны, як днямі ў горадзе абрабавалі яшчэ адну навучальную ўстанову — Віцебскі філіял Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін.

Супрацоўнікі бухгалтэрыі інстытута пайшлі паснедаць, пакінуўшы ключы ад сейфа на стале ў замкнёным кабінеце. Злодзей нейкім чынам адчыніў дзверы і скраў з сейфа каля 15 мільёнаў — унёскі студэнтаў-завочнікаў за навучанне, а таксама частку заробку выкладчыкаў.

Два крадзяжы з вышэйшых навучальных устаноў вельмі падобныя, але праваахоўныя органы пакуль не робяць высноў аб тым, што іх здзейсніў адзін і той жа злодзей.

Дарэчы, як паведаміў Еўрарадыё начальнік абласнога УУС Леанід Фармагей, калі ў вобласці здарыцца яшчэ нешта падобнае, міліцыя мае намер прыцягнуць да крымінальнай адказнасці кіраўніцтва прадпрыемства ці арганізацыі, дзе адбудзецца злачынства — за халатнасць.

КРИМИНАЛ

## *Строители пирамид предстанут перед судом*

В суде Партизанского района Минска 3 декабря начнутся слушания по делу о создании финансовой пирамиды.

В ходе открытого процесса будут заслушаны обвинения в отношении 10 граждан Беларуси, которые, в соответствии с материалами дела, обвиняются в мошенничестве в особо крупном размере, связанном с завладением денежными средствами граждан под предлогом передачи вступительных взносов в клубы "Бизнесклубастран", "Энерджиклуб" и "Экономклуб", проводившие информационные семинары по всей Беларуси.

Организация занималась созданием финансовой пирамиды с 1997-го по 2003 год. Потерпевшими признаны более 1670 жителей страны, которым был причинен ущерб на сумму свыше 1,7 миллиона долларов.

ПАМЯЦЬ

# Пад Барысавам перазахавалі французскіх салдат

*У мінулую нядзелю на Барысаўшчыне адзначалася 195-годдзе бітвы на Бярэзіне. У гэты дзень на левым беразе ракі каля вёскі Студзёнка адбылося перазахаванне 223 французскіх салдат, загінуўшых у 1812 годзе.*



У цырымоніі перазахавання парэшткаў воінаў арміі Напалеона брала ўдзел амбасадар Францыі ў Беларусі Мірэй Мюсо, прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў Францыі, Міністэрства Узброеных сіл Беларусі, а таксама французы, якія жывуць у Беларусі.

Парэшткі 223 французскіх салдат былі знойдзены ў жніўні 2005 года каля вёскі Селішчы Вілейскага раёна вайскоўцамі 52-га спецыялізаванага пошуковага батальёна Узброеных сіл Беларусі. Ідэнтыфікаваць салдат удалося, дзякуючы знойдзеным на месцы раскопак гузікаў з надпісам "Рэспубліка Францыя". Былі таксама знойдзены нумарныя гузікі, якія належалі салдатам розных французскіх палкоў.

Выступаючы на цырымоніі перазахавання, амбасадар Францыі ў Беларусі Мірэй Мюсо, у прыватнасці, адзначыла, што тых, хто нарадзіўся на тэрыторыі Беларусі і ваяваў у французскай арміі, роўна столькі ж, колькі салдат ваявала на баку расійскай імператарскай арміі: "Адносіны сярод вайскоўцаў пацвярджаюць, што так званае брацтва па зброі — не пустое слова. Яно праяўляецца ў адносінах да замежных салдат, якія некалі былі ворагамі. Гэтыя сотні тысяч салдат і тысячы грамадзян, якія загінулі на неабсяжных прасторах Беларусі і Расіі падчас знішчальнай рускай кампаніі 1812 года, належаць усім нам".

Мадам Мюсо выказала падзяку беларускім вайскоўцам, якія знайшлі французскіх салдат. Акрамя таго, амбасадар заўважыла: "Мне хацелася б, каб у памяць загінуўшых тут дзяцей еўрапейскіх нацый, па які б бок іх ні развяло палітычнае жэрабя ў 1812 годзе, гэта памятная цырымонія, як і будучыя цырымоніі, прадастаўлялі нам магчымасць несці разам агонь надзеі на тое, што наш еўрапейскі кантынент, дзе так шчыльна перамяшаліся культуры, гісторыя, традыцыі і памяць, стане агульнай радзімай свабоды, міра, дабрабыту і бяспекі для ўсіх краін Еўропы".

Цырымонія перазахавання французскіх салдат скончылася рэканструкцыяй вайсковай баталіі, якая адбылася на Бярэзіне ў 1812 годзе.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**
**Фота photo.bymedia.net**

*Дарэчы, у той жа дзень на правым беразе Бярэзіны былі перазахаваны парэшткі расійскага салдата той самай вайны. Мадам Мюсо ўсклала кветкі да яго апошняга прытулку.*



РЭГІЁН

## *Гараджане жадаюць святла*

**Група грамадзян, жыхароў вуліцы Бранскай у Гомелі, звярнулася да намесніка старшыні гарвыканкама Сяргея Лузая з калектыўнай скаргай на парушэнне пастановы Савета міністраў аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва.**

Як паведаміў БелаПАН адзін з ініцыятараў звароту Андрэй Аксёнаў, на аддаленай ад цэнтра горада вуліцы Бранскай не выконваюцца сацыяльныя стандарты, зацверджаныя Саўмінам.

"У той час, калі цэнтр горада зіхаціць усімі колерамі вясёлкі, на ўскрайкавых вуліцах жыхары пакутуюць ад недастатковага асвятлення. Прыклад таму — вуліца Бранская. У адпаведнасці з пастановай аб сацстандартах, удзельная вага асветленасці вуліц у Гомелі павінна складаць не менш за 80%. У выніку нашай праверкі было ўстаноўлена, што з 49 свяцільняў гарэла 27, у нерабочым стане знаходзілася 22. Значыць, удзельная вага асветленасці складала 55%, што на 25% ніжэй за ўстаноўлены нарматыў абслугоўвання. Жыхары вуліцы патрабуюць не нейкіх дадатковых ільгот або патуранняў для сябе, а выканання ад мясцовых чыноўнікаў пастановы Саўміна", — падкрэсліў А.Аксёнаў.

Паводле яго слоў, стандарты ў галіне ЖКГ — гэта мінімальны ўзровень дзяржаўных гарантый сацыяльнай абароны насельніцтва. 13 з 44 стандартаў, у адпаведнасці з пастановай Саўміна, павінны быць укаранёныя ў Беларусі да 1 кастрычніка 2005 года. "Два гады прайшло з таго часу, калі ўсе адказныя асобы ў справаздачах запэўнілі, што сацстандарты ў Гомелі выконваюцца, а на самай справе як была палова вуліцы неасветленай, так і сёння святлей там не стала", — падкрэсліў суразмоўца.

**Алена ГЕРМАНОВІЧ.**

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

# Мы хочам, каб Вам жылося лепш

А таму і выдаём "Народную волю".

Газету, для якой галоўнае — даносіць да людзей праўдзівую інфармацыю.

Газету, для якой няма забароненых тэм.

Газету, якая служыць не ўладзе, не партыям, а народу, Беларусі.

Газету, якая ўсё робіць дзеля таго, каб Вам жылося лепш.

Не спазніцеся, шаноўныя, з **перадаплатай** за нумары першай паловы 2008 года.

Паўтараем: мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіцца, то выгадна зрабіць **перадаплату** за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

**УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

0402280179

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**ИЧУП «Народная воля»**
получатель платежа
**«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск**
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

**ИЧУП «Народная воля»**
получатель платежа
**«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск**
наименование банка
Счет получателя **3012006535014** Лицевой счет **код 749**
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г., январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

**Абонентская карточка**

*на номера газеты «Народная воля»*
**за ноябрь, декабрь 2007 г.,**
**за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.**
*(ненужное зачеркнуть)*

*Заполняется отчетливо* ***печатными буквами и обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия

имя отч.

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

*город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)*

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом ___ корп. кв.
а,б,в,г

*(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)*

**Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!**

## *Начная рамантыка скончылася трагічна*

**Каля будынка інтэрната Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны быў знойдзены труп студэнта 4-га курса. Як паведамілі БелаПАН у АУС Цэнтральнага раёна Гомеля, вынікі судмедэкспертызы паказалі, што смерць наступіла ў выніку падзення прыкладна з трэцяга паверха.**

Паводле слоў аператыўнікаў, якія праводзілі праверку здарэння, студэнт жыў у інтэрнаце і позна вяртаўся назад, бо адзначаў з сябрамі свята ў адным з начных клубаў горада. Інтэрнат ноччу зачынены, і малады чалавек хутчэй за ўсё вырашыў трапіць у пакой не праз цэнтральны ўваход. Пераадолеўшы два паверхі па кратах на вокнах, ён спрабаваў трапіць у інтэрнат па пажарнай лесвіцы, якая пачынаецца з трэцяга паверха, але сарваўся.

Паводле слоў жыхароў інтэрната, прыкладна а другой гадзіне ночы яны чулі глухі стук, але не надалі гэтаму ўвагі. Цела загінуўшага знайшлі толькі раніцай.

Пракуратура Цэнтральнага раёна Гомеля праводзіць праверку па факце гібелі маладога чалавека.

**Алена ГЕРМАНОВІЧ.**

*Редакционное удостоверение УП "Народная воля", выданное специалисту СТО Гацаку Леониду Геннадьевичу, считать недействительным.*

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 328-69-04, 328-69-06.**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**
**Індэкс 63222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, правы ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 28.11.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №